Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СНЕЖАНЬ 16 1933 г. СУБОТА № 277 (4821) Год выдання XVII

СКАНДАЛЬНЫ ФІНАЛ ЛЕЙПЦЫГСКАГА СУДЗІЛІШЧА

Лейпцыгская судовая камедыя падходзіць да канца. Амель тры месяцы гэтае бяспрыкладнае відовішча, апіднае і нікчэмнае відовішча фашысцкіх падпальшчыкаў, працягвала парад усім светам.

Наўрад ці ведае гісторыя палітычных працэсаў за апошнія гады прыклад рэвалюцыйнай стойкасці і беззаветнай адданасці сваёму класу, падобны таму, які быў паказан Дзімітравым і яго трыма таварышамі. Іх прохмесячная барацьба мае вялізарнае палітычнае значэнне і ва многім іменна яна тлумачыць, чаму фашыстам прышлося, урэшце, перад усім светам фактычна прызнаць вусныя спазі пракурораў, што ЛЕЙПЦЫГСКІ ПРАЦЭС БЫЎ ГНУСНАСЦЮ ПАНУЮЧЫХ КЛАСАЎ.

Чым далей зацягваўся працэс, тым безвыхадней рабілася становішча іх тэатхніцеляў. Чым далей, тым больш відавочна станавілася іх непасрэдная адказнасць за падпал, тым яшчэй рабіліся мэты, якія праследаваліся імі пры арганізацыі правакацыі 27-га лютага.

СУД НЕ МОГ ПРАДСТАВІЦЬ НІ АДНАГО ДОВАДА, ЯКІ-Б АПРАЎДВАЎ ФАШЫСЦКІХ ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ. Але за тое на судзе знаходзіліся неабвержныя доказы, выкрываўшыя фашысцкую хітасьцю ў тым, што ўсё яе прадпрыемства ёсць не больш як грандыёзная фальсіфікацыя.

Тры месяцы цягнуўся суд. Допытаны дзесяткі сведак. Выказвалі свае прамовы пракурор і яго памочнік. Але дзе-ж абвінавачыны акт? Чаму ён так і не ўбачыў света? Гэта фальшыўка настолькі прубай работы, што не рашылі апасіць. АЛЕ АБВІНАВАЧЫЛ АКТ ІСНУЕ І ЁН ДОБРА ВЯДОМЫ. Ён атрымаў гіганцкае распаўсюджанне па ўсяму свету яго фанты не атрэзімы, яго до вазы кім і нічым не абвергнуты.

Гэты абвінавачыны акт — «КАРЫЧНЕВАЯ КНІГА».

Яе прабавалі замаўчаць. Але яе падняялі над светам мільёны рук. Кожная яе старонка — гэта рубец, а ўся яна ў цэлым дае выпукла і ярка аблічча фашысцкага рэжыма, яго метадаў, яго мэт і канкрэтных абвінавачыны ў падпале рэйхстага і быў шай за ім хвалі пагромаў, распраў і масавых забойстваў. Ад «Карычневай кнігі» сулаяжна абаранялися на судзе фашысцкія саноўнікі, ад яе ў роспачы абараняў пан Вернер увесь фашысцкі рэжым.

Кепска абараняў. Нікчэмна, глупа і смешна. «Карычневая кніга» прымусіла загаварыць аб слба. Пан Вернер лічыць «Карычневую кнігу» «абвергнутой». Кім? Чым? Адказа на гэта пан пракурор не дае. Доказаў ён не жадае наогул прыводзіць. Такой-жа тактыкі прытрымліваецца і яго памочнік Парызіус. Гэтыя паны гаварылі не менш 12 гадзін, але калі разабрацца ў гэтым патоку галаслоўных цверджанняў, нікчэмных увертак і аргументаў, то аказваецца, што парад намі фашысцкае выдаўмане стварэных баек тысячы і адной ночы.

Што маглі зрабіць пракуроры, гэтыя абаронцы сапраўдных падпальшчыкаў, пасля таго як на працягу трох месяцаў фашысцкім суддям ім не ўдалося выгаварадзіць сваіх заспадароў.

І Вернер, і Парызіус прабавалі — з усякай, між іншым, нагоды і без — абгрунтаваць тэзіс, што ван дэр-Люббе — комуніст, што ён атрымаў рэйхстаг дзеля таго, каб падаць сігнал да паўстання». Стара-паліцэйская байка! Чаму-ж, паўстанне пытанне, гэты сігнал не быў дадзены? А таму,—адказвае глыбокадумна пракурор Вернер, — што масы не атрымалі дырэктывы аб паўстанні з цэнтра. А не атрымалі іх дырэктывы таму, што былі забойцы кур'еры, якія павінны былі дастаўляць гэтыя дырэктывы на месцы і, такім чынам, хоць сігнал і быў дан, але паўстанняў не паследавала. Гэта адзін з грунтоўных аргументаў абвінавачання. Але дзіўна: калі былі забойцы кур'еры, ТО ХТО ЯНЫ? КАЛІ ЯНЫ БЫЛІ ЗЛОЎЛЕНЫ? ДЗЕ? ЯКІЯ Ў ІХ БЫЛІ ВЫКРЫТЫ ДЫРЭКТЫВЫ? ДЗЕ ЯНЫ ЗНАХОДЗЯЦЦА ЗАРАЗ? ЧАМУ ІХ НЕПРЫВОДЗІЦЬ ПАН ВЕРНЕР? ЯК МАГЛО ЗДАРЫЦЦА, ШТО ГЭТЫХ ВАЖНЕЙШЫХ ДАКУМАНТАЎ НЯМА Ў СПРАВАХ СУДА? І ДЗЕ-Ж ГЭТЫЯ КУР'ЕРЫ? ЧАМУ ІХ НЕ ДАПЫТВАЮЦЬ?

Што можа пракурор адказаць на гэтыя запытанні? Нічога. І такіх запытаннаў фашысцкі суд унікаў усімі сіламі, і іменна таму ён дзесяткі раз выключаў Дзімітрава, адхіляў усе яго патрабаванні і запытанні, бо больш усяго лейпцыгскія судзі асцярагаліся таго, як-бы ён прамым чынам не пацвердзіў даныя «Карычневай кнігі». Але суддзі даволі многа, калі не ўсё, пацвердзілі прама і ўскосна.

Так, ДЗІМІТРАЎ ужо даволі падрабязна даказаў ілжывасць фашысцкай версіі аб тым, што компартыя рыхтавала ў тайным узброенае паўстанне. Але абвінавачанне не можа адмовіцца ад гэтага пункта, бо тады прышлося-б прама сказаць, што ўвесь працэс з пачатку да канца аснован на фальсіфікацыі.

Абвінавачанне не смее падтрымліваць скандальна праваліўшыйся тэзіс аб непасрэдным дачыненні германскай компартыі да падпала рэйхстага.

Яму нічога не застаецца таму апроч як настойваць на «палітычнай адказнасці компартыі». Пры гэтым пан Вернер спасылаецца на сведак, «заслугоўваючых давер'я».

Але хто-ж гэтыя сведкі абвінавачання, якія, па думцы пракуроў, «заслугоўваюць давер'я»? На працэсе фігуравалі амаль выключна такія сведкі, якія давалі патрэбныя абвінавачанню паказанні. Па няпоўных даных суседняга друку можна атрымаць уяўленне аб гэтай «апоры і надзеі» суддзяў і пракураў.

Сярод сведкаў абвінавачання ёсць: ДВАЦЦАЦЬ ПАЛІЦЭЙСКІХ ЗНАДВОРНАЙ ПАЛІЦЫІ, КРЫМІНАЛЬНАЙ ПАЛІЦЫІ, ПАЛІЦЭЙСКІХ КАМІСАРАЎ І ІНСПЕКТАРОЎ, ШЭСЦЬ ПРАВАКАТАРАЎ, ДВА ЗЛОДЗЕІ (і тыя і другія былі выкрыты на судзе Дзімітравым і іншымі комуністамі - абвінавачанымі), ВОСЕМ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЧЫНОЎНІКАЎ, СЯРОД ІХ КАМЕНДАНТ ДОМА ГЕРЫНГА, ТРЫ ФАШЫСЦКІХ ДЭПУТАТЫ, СЕМ ФАШЫСЦКІХ АКТЫВІСТАЎ, АДЗІН ВАР'ЯТ І, урэшце, ГЕРЫНГ І ГЕБЕЛЬС.

Паўтараем, гэта НЕ ПОЎНЫ спіс, але і ён зусім выстарчальны. На паказаннях гэтых сведак і пакоіцца ўвесь будынак ілжы, пабудаваны Вернерам і Парызіусам.

Аб тым наколькі яўна гэтыя сведкі хлусілі на судзе, паказвае той факт, што пракурор, які апіраецца на іх паказанні, усё-ж быў вымушан адмовіцца ад абвінавачання супроць балгарскіх таварышоў.

А між тым дзесяткі сведак «сваімі (!) упаснымі» вачыма бачылі Дзімітрава, Торглера, Папова і Танева то разам з Ван дэр-Люббе, то асобна ў памяшканні рэйхстага ў момант яго падпала!..

Заслугоўвае ўвагі і тое, з якой стараннасцю Парызіус даказваў процілеглае таму, што сцвярджаецца ў сакрэтным абвінавачым акце. Як вядома, апошні сцвярджае, што Ван дэр-Люббе падпаліў рэйхстаг адзін. ДА ГЭТАГА фашысты сцвярджалі, што Ван дэр-Люббе маў саўдзельнікаў.

Гэта было да СУДА, у разгар тэрора супроць компартыі. Калі пачаўся суд, Ван дэр-Люббе быў перавёдзен у падпальшчыка - адзіночку. Пасля таго як абвінавачыны акт старанням міжнароднага камітэта абароны ахвяр фашысцкага тэрора зрабіўся здабыткам гласнасці, фашысцкім суддям стала ясна, што не магчыма абараняць тэзіс аб падпальшчыку-адзіночцы. І пракурор Парызіус узяў на сябе цяжкую задачу, калі ён, следуючы ўказаням з верху, павінен быў зрабіць чарговы паварот на 180 градусаў і абараняў тэзіс, што Ван дэр-Люббе дзейнічаў не адзін.

6 гадзін гаварыў Парызіус, але ні адной мінуты ён не прысвяціў асобам сапраўдных саўдзельнікаў Ван дэр-Люббе. Тое, што Ван дэр-Люббе дзейнічаў не адзін, усім вядома, ВЯДОМА ТАКСАМА, ХТО ЯГО САЎ ДЗЕЛЬНІКІ. «Карычневая кніга» на зывае імёны і дае падрабязнае апісанне таго самага падземнага хода, да якога вядуць усе ніці гэтай гран дыёзнай фашысцкай правакацыі.

Але пракурор Парызіус не можа, натуральна, назваць сапраўдных саўдзельнікаў. І вось, аказваецца, што агромадная фашысцкая дзяржаўная машына, тайная і яўная паліцыя, штурмавыя атрады, шырачэзная сетка шпіянажа — усе гэтыя сродкі аказаліся бездапаможнымі і не змаглі выявіць саўдзельнікаў.

Якая бязглуздая хлусня! Якія бяздарныя байкі! Саўдзельнікі не выяўлены таму, што прышлося-б фізічна пасадзіць фашысцкіх лідэраў на лаву падсудных. ПРАМОВА ПАРЫЗІУСА ГЭТА ПАЦВЯРДЖАЕ.

Першыя-ж два дні апошняга этапа суда сведчаць аб канчатковым выкрыцці фашысцкіх падпальшчыкаў. Пракурор сам нанёс сакрушальны ўдар фашысцкім фальсіфікацыям— аказаўшыся вымушаным пад напорам фактаў і абуранай грамадскай думкі працоўнага чалавецтва адмовіцца ад абвінавачання супроць Дзімітрава, Папова і Танева. Але ён патрабуе крыві тав. Торглера. Фашысцкая дыктатура не хоча поўнасцю прызнацца ў сваіх злачынствах. Трэба яе прымусіць.

РУКІ ПРЭЧ АД ТАВ. ТОРГЛЕРА! Ва ўсім свеце ўжо падняўся агромадны рух пратэста супроць фашысцкага тэрора і супроць крывавых замыслаў вынайдзеных падпальшчыкаў. Гэты пратэст гучыць усё мацней, усё вышэй узнімаецца патрабаванне мільёнаў працоўных: СВАБОДУ ДЗІМІТРАВУ, ПАПОВУ, ТОРГЛЕРУ І ТАНЕВУ! СВАБОДУ ТАВ. ТЭЛЬМАНУ! СВАБОДУ ТЫСЯЧАМ ЗНЯВОЛЕНЫХ У ТУРМАХ І КАНЦЛАГЕРАХ.

Канчаткова выкрыта гнусная камедыя лейпцыгскага суда, канчаткова выкрыта версія аб тым, што компартыя рыхтавала ў тайным узброенае паўстанне. Гэтай версіяй, як і падпалам рэйхстага, фашысты прабавалі апраўдаць свой раз'юшаны тэрор супроць рабочага класа і супроць компартыі. ЗВЫШ ДВУХ ТЫСЯЧ ЗАБІТЫХ, ТЫСЯЧЫ ПАКАЛЕЧАНЫХ, СОТНІ ТЫСЯЧ АРЫШТАВАНЫХ — такавы лічбы, якія даюць прыблізнае ўяўленне аб той пашасе тэрора, сігналам да якой быў падпал фашыстамі будынка рэйхстага.

Германскія пролетарыі, германскія комуністы не здрадзілі свайму баявому комуністычнаму сцягу. Фашысцкая правакацыя выкрыта. Барацьба ідзе далей, барацьба цяжкая і ўпартая. АЛЕ СПРАВА ГЕРМАНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ВЕРНЫХ РУКАХ ЯГО ПАРТЫІ, ЯКАЯ БЫЎШЛА ПЕРАМОЖНІЦАЙ З ЗАЛЫ ЛЕЙПЦЫГСКАГА СУДА. Гэта не адзіная перамога германскіх комуністаў за час барацьбы ва ўмовах цяжкага падполля. Рэвалюцыйны марксізм прадаўжае сваю вялікую справу.

Іменна зараз трэба напомніць словы Энгельса, звернутыя да Бебеля ў пісце ад 25 жніўня 1861 г.:

«Прыйдзе час, калі вясна павее другім ветрам. Пакуль што вам прыходзіцца... на сваёй спіне выносіць гнуснасці ўрада і буржуазіі, а гэта не жарты. Але не забудзьце ні аб адной подласці, зробленай вам і ўсім нашым таварышам. Час помсты не за гарамі». (Скарочаны артыкул «ПРАВДЫ», перададзены па радыю).

ЛЕЙПЦЫГСКІ ПРАЦЭС

РУКІ ПРЭЧ АД ТОРГЛЕРА!

Свабоду Торглеру, Дзімітраву, Папову, Таневу

ПАТРАБАВАННІ ПРАКУРОРА НА ЛЕЙПЦЫГСКІМ ПРАЦЭСЕ

ЛЕЙПЦЫГ, 14 снежня. (БЕЛТА). Вярхоўны пракурор патрабаваў наступнага прыгавора абвінавачаным:

1) Ван дэр-Люббе за замах на звяржэнне дзяржаўнага лада ў злучэнні з трыма падпаламі і адной спробай падпала, на падставе параграфаў 81, 82 і 308, а таксама дэкрэта аб абароне дзяржавы і надзвычайнага закона аб кары смерцю ад 29-га сакавіка — да кары смерцю.

2) ТОРГЛЕРА за дзяржаўную здраду ў злучэнні з сур'ёзным падпалам на падставе тых-жа законаў—да кары смерцю.

3) ДЗІМІТРАВА, ПАПОВА, ТАНЕВА па абвінавачанню ў замаху на звяржэнне дзяржаўнага лада ў злучэнні з падпалам, з-за недахопа доказаў — апраўдаць.

НІКЧЭМНЫЯ ПАТУГІ ПАНА ВЕРНЕРА

ЛЕЙПЦЫГ, 14 снежня. (БЕЛТА). Вярхоўны пракурор Вернер у сваім сённяшнім — другім — выступленні спыняецца спачатку на абвінавачанні Торглера, апіраючыся пры гэтым на праваліўшыяся паказанняхраду сведак абвінавачання Кунцака, Гротэ, Лебермана і іншых. Пракурор прызнае, што кожнае з гэтых паказанняў у паасобку недастаткова, але сцвярджае, што «ўсе гэтыя паказанні, разам узятыя, заслугоўваюць давер'я».

Вернер вымушан прызнаць, што няма ні аднаго чалавека, які непасрэдна ведаў-бы, што 4 абвінавачаных комуністы былі ўдзельнікамі падпала. Вось чаму пракурор хоча даказаць іх віноўнасць на аснове «аналіза акалічнасцяй, якія могуць указваць на саўдзельнасць падсудных комуністаў».

Сцвярджаючы, што падпал мог быць выгодным толькі компартыі, якая павінна была-б з моманта прыходу Гітлера да ўлады або адмовіцца ад сваёй мэты, альбо паспрабаваць прыняць бой і дабіцца перамогі, гэту «аргументацыю» пракурор лічыць дастатковай для сцвярджэння аб віноўнасці Торглера. У якасці доказа таго, што Торглер у момант падпала нібыта знаходзіўся ў рэйхстагу, пракурор спасылаецца на паказанне аднаго з «сведкаў» абвінавачання, заявіўшага, што ён не то 25, не то 27-бачыў Торглера ў рэйхстагу з пакункам у руках завернутым у карычневую паперу. Аднак, як вядома, на судзе ўстаноўлена, што 25-га лютага Торглер прыйшоў у рэйхстаг з белым пакункам у руках, змяшчаўшым, паводле слоў Торглера, пірожныя.

Пытанне, ці быў Торглер 27 лютага ўвесь дзень у будынку рэйхстага, ці не, пракурор лічыць, урэшце, неістотным. Паводле слоў пракурора, значна больш важным з'яўляецца пытанне аб тым, ці займаўся Торглер «нармальнай дзейнасцю». Паказанні двух сведак, што яны ў дзень падпала рэйхстага ў час ад 7 да 8 гадзін вечара ўбачылі ў пакоі Торглера, але не даведаліся, пракурор лічыць дастатковым «доказам» таго, што Торглер у гэты адрэзак часу мог займацца падрыхтоўкай падпала рэйхстага.

Далей пракурор спыняецца на паказаннях сведкі Гротэ, які, як вядома, заявіў, што мяркуемае нібыта паўстанне не адбылося, бо «сарвалася справа з кур'ерамі ЦК». Вярхоўны пракурор лічыць усе паказанні сведак, якія абвяргаюць заяву Гротэ, не заслугоўваючымі давер'я. У той-жа час ён вымушан прызнаць, што паказанням Гротэ нельга прыдаваць рашаючага значэння. Тым не менш у яўнай супярэчнасці з раней сказаным пракурор заўважае, што «няма доказаў таго, што паказанне Гротэ не адпавядае сапраўднасці».

Далей пракурор спасылаецца на паказанні «сведкі» абвінавачання Лебермана, заявіўшага, што Торглер нібыта вербаваў яго ў 1932 г. для падпала грамадскіх будынкаў. Але тут-жа пракурор не можа не прызнаць, што паказанні гэтага «сведкі» з вялікім крымінальным мінулым самі па сабе недастатковы. Пракурор у якасці далейшага «доказа» віны Торглера спасылаецца на паказанні «сведкі» абвінавачання — злодзея рэцыдывіста Кунцака, аднак, і яго паказанні ён вымушан прызнаць «недастатковымі», хоць і «не абвергнутымі».

На аснове сваяасаблівага «сінтэза» гэтых паказанняў, кожнае з якіх «само па сабе недастаткова», пракурор прыходзіць да вывада, што падазрэнне ва ўдзельнасці Торглера ў падпале рэйхстага «абгрунтавана».

ПРАКУРОР ПАТРАБУЕ ВЫНЕСЦІ ТОРГЛЕРУ СМЯРОТНЫ ПРЫГАВОР ПА АБВІНАВАЧАННЮ Ў «ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГА» і «ЗАМАХУ НА ЗВЯРЖЭННЕ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДА».

Патрабаванне пракурора аб кары смерцю ТОРГЛЕР ВЫСЛУХОЎВАЕ З ПОЎНЫМ СПАКОЕМ І ВЫТРЫМАНАСЦЮ. З няменшай абыякасцю выслухваюць балгарскія комуністы прапанову пракурора апраўдаць іх з-за адсутнасці доказаў. Ван дэр-Люббе зусім безузлельны сядзіць з пёзка апушчанай галавой.

У пачатку вячэрняга пасяджэння, перад тым, як пракурор пачаў прамову аб балгарах, старшыня, звярачаючыся да Дзімітрава, указвае яму, што ён у часе прамоў пракураў «гіранічна ўсміхаўся», і гэта з'яўляецца «правакацыяй і непашанай суда». Дзімітраў устае і паўголасна заяўляе: «Мне мнотае сапраўды здаецца смешным». Старшыня ставіць на від Дзімітраву яго заўвагу і заяўляе, што абвінавачаныя могуць быць выключаны з залы таксама і ў часе спрэчак бакоў. «Сядзьце. Я не хачу больш вас слухаць», — рэзка заяўляе старшыня.

Затым Вернер прыступае да абгрунтавання сваёй прапановы аб прытаворы балгарам. Ходь пракурор і прапанаваў апраўдаць балгар, ён усім ходам сваіх разважанняў імкнуўся стварыць уражанне, што падазрэнні супроць балгар мелі падставу. Апісаўшы актыўную рэвалюцыйную дзейнасць балгар у сваёй краіне, пракурор падкрэслівае, што ўсе тры прыехалі ў Германію ў той момант, «калі компартыя рыхтавалася да ўзброенага паўстання».

Гэта ён лічыць «падазроным» і указвае, што балгары не далі заслугоўваючых давер'я даных аб тым, што яны не цікавіліся германскімі справамі. Ён лічыць «мала праўдападобным», што Дзімітраў, будучы ў Германіі, займаўся толькі балгарскімі справамі, але, — гаворыць ён, — няма доказаў таго, што Дзімітраў вёў іншую дзейнасць.

Асноўнымі паказаннямі супроць балгар, пракурор лічыць паказанні кельнера рэстарана Байернгоф Гельмера. Як вядома, Гельмер сцвярджаў, што ён бачыў Ван дэр-Люббе сярод балгар у Байернгофе ўлетку 1932 г. Указаўшы, што ўстаноўлена і даказана дакументальна, былым Ван дэр-Люббе не мог быць у Германіі і быў у Галандыі, пракурор лічыць, што гэта расхістае паказанні Гельмера.

«Няма ніякай безумоўнай упэўненасці, — гаворыць ён, — што Ван дэр-Люббе сустракаўся з балгарамі. Паколькі паказанні Гельмера расхістаны, пракурор лічыць, што нельга даказаць, што балгары мелі адносіны да падпала рэйхстага. Акалічнасці, прыведзеныя мною тут, — заканчвае пракурор,—гавораць за тое, што балгары займаліся ў Германіі недазволенай дзейнасцю, маючай адносіны да падрыхтоўкі германскай рэвалюцыі. Многае гаворыць за гэта, але тое, што яны мелі адносіны да падпала рэйхстага, на маю думку, не даказана з дастатковай акрэсленасцю». Пракурор адмаўляецца ад абвінавачання балгар. З прычыны таго, што адвакат Зейферт просіць перанесці яго выступленне на заўтра, першым выступіць адвакат Тэйхерт.

ТЫСЯЧЫ ПОДПІСАЎ НА ПЕТЫЦЫЯХ З ПАТРАБАВАННЕМ ВЫЗВАЛЕННЯ АБВІНАВАЧАНЫХ КОМУНІСТАЎ

ПАРЫЖ, 14 снежня (Белта). Міжнародная следчая камісія па справе аб падпале рэйхстага адправіла Вярхоўнаму суду Германіі наступную тэлеграму:

«Згодна справаздачам, апублікаваным у газетах, Герынг дапусціў новае ўмяшанне ў судовую працэдуру.

У момант, калі працэс уступіў у канчатковую стадыю, Герынг заяўляе, што зусім не неабходна прытрымлівацца артыкулаў закона. Калі суд не пратэстуе супроць такой заявы, дык гэтым самым ён пацвердзіць нашы перакананні, што не толькі сведкі і эксперты, але і суддзі знаходзяцца пад моцным націскам з боку асоб, што знаходзяцца ва ўладзе».

Адначасова з гэтым паведамляюць, што па ўсёй краіне расце рух пратэста супроць лейпцыгскага працэса. У германскае пасольства ў Парыжы паступаюць штодзень дзесяткі рэзалюцый, прынятых на агульных сходах. У рэдакцыю «Юманітэ» дастаўлены ДЗЕСЯТКІ ПЕТЫЦЫЙ, ПАКРЫТЫХ ТЫСЯЧАМІ ПОДПІСАЎ З ПАТРАБАВАННЕМ ВЫЗВАЛЕННЯ АБВІНАВАЧАНЫХ КОМУНІСТАЎ.

„ВЯРХОЎНЫ ПРАКУРОР ХУТЧЭЙ АБАРАНЯЕЦЦА, ЧЫМ АБВІНАВАЧВАЕ"

ПАРЫЖ, 14 снежня (БЕЛТА). Газеты даволі шырока асвятляюць заключную фазу лейпцыгскага працэса. Думка многіх газет аб прамовах абвінавачвання выразна сфармулявана ў кароткай заметцы «Эко дэ Пары» «ВЯРХОЎНЫ ПРАКУРОР ХУТЧЭЙ АБАРАНЯЕЦЦА, ЧЫМ АБВІНАВАЧВАЕ».

Большасць газет змяшчаюць або поўнасцю, або ў вытрымках вялікія тэлеграмы Гавас, у якіх выказваецца тая-ж думка.

«Адчуваецца, — гаворыць карэспандэнт Гавас,—што Вернер перш за ўсё заклапочан абвяржэннем «Карычневай кнігі».

«ЧАСАМІ СТВАРАЕЦЦА ЎРАЖАННЕ, ШТО ЁН НЕ СТОЛЬКІ АБВІНАВАЧВАЕ, КОЛЬКІ ГАВОРЫЦЬ АБАРОНЧУЮ ПРАМОВУ».

***

ПАРЫЖ, 14 снежня (БЕЛТА). Усё паведамленне Гавас з Лейпцыга вытрымана ў тонах вялікага спачування Торглеру, абвінавачаным балгарам і, асабліва, Дзімітраву.

У паведамленні даецца зразумець, што Дзімітраў паравейшаму астаецца для суда грозным праціўнікам, з якім не пад сілу цягацца судовым чыноўнікам.

Апісваючы паводзіны Дзімітрава ў часе прамовы Вернера, Гавас падкрэслівае, што Дзімітраў сочыць за прамовай з іранічнай усмешкай.

Кашэн у «Юманітэ» суцэтаўляе прамову пракурора Вернера з заявай Герынга на судзе, а таксама з яго заявамі, апублікаванымі 12-га снежня ў адной берлінскай вячэрняй газеце. У заключэнне «Юманітэ» заклікае да арганізацыі магутнага масавага руху пратэста супроць падрыхтоўваемага ў Лейпцыгу злачынства.

ХВАЛЯ ДЭМАНСТРАЦЫЙ СУПРОЦЬ ЛЕЙПЦЫГСКАГА СУДЗІЛІШЧА АМЕРЫКАНСКІЯ ПРОЛЕТАРЫІ ПАДНІМАЮЦЦА НА АБАРОНУ ТОРГЛЕРА, ДЗІМІТРАВА, ПАПОВА І ТАНЕВА

Н'Ю-ЮРК, 14 СНЕЖНЯ. (БЕЛТА).

КОМПАРТЫЯ, ЛІГА ПРАФСАЮЗНАГА АДЗІНСТВА І ІНШЫЯ РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ РЫХТУЮЦЬ 19-ГА СНЕЖНЯ ДЭМАНСТРАЦЫЮ Ў АБАРОНУ РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ ПАДСУДНЫХ ЛЕЙПЦЫГСКАГА ПРАЦЭСА.

НЕКАЛЬКІ СОТЕНЬ Н'Ю-ЮРКСКІХ МЕТАЛІСТАЎ ПАРАШЫЛІ СПЫНІЦЬ РАБОТУ НА 15 МІНУТ 19-ГА СНЕЖНЯ Ў ЗНАК ПРАТЭСТА СУПРОЦЬ ПРАЦЭСА. ТЫМ ЧАСАМ АДБЫВАЮЦЦА ШМАТЛІКІЯ ПАДРЫХТОЎЧЫЯ МІТЫНГІ І ДЭМАНСТРАЦЫІ.

УЧОРА 500 ЧАЛАВЕК ПРЫМАЛА ЎДЗЕЛ У ПАХОДЗЕ ДА ГЕРМАНСКАГА КОНСУЛЬСТВА Ў ДЭТРОЙЦЕ. ПАЛІЦЫЯ НАПАЛА НА ДЭМАНСТРАНТАЎ І РАССЕЯЛА ІХ. ТЫСЯЧА СТУДЭНТАЎ РОЗНЫХ УНІВЕРСІТЭТАЎ АРГАНІЗАВАЛІ АНТЫФАШЫСЦКУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ КАЛЯ КАЛУМБІЙСКАГА УНІВЕРСІТЭТА, ДЗЕ ВЫСТУПІЎ ГЕРМАНСКІ ПАСОЛ ЛЮТЭР.

СТАНОВІШЧА НА КУЧ

МАНЧЖУРСКАЯ ПАЛІЦЫЯ ПРАДАЎЖАЕ АРЫШТЫ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН

ХАБАРАЎСК, 13 снежня (БЕЛТА).

Прывезены пад канвоем у Харбін памочнік начальніка ўчастка службы цягі на ст. Буху гр. Кірылаў, раней вызвалены з-пад арышту 10-XII-г. г., зноў арыштаван харбінскай паліцыяй.

На ст. Буху 11 снежня паліцыя арыштавала совецкага грамадзяніна майстра дэпо Сіманава. Кіраўнік КУЧ т. Руды патрабаваў пісьменна ад начальніка паліцыі спынення ўмяшання чыноў паліцыі ў работу чыгуначных агентаў і неадкладнага вызвалення арыштаваных.

ПРАКУРОР МАНЧЖУРСКАГА СУДА АДКРЫТА СТАНОВІШЦА НА ШЛЯХ ПАРУШЭННЯ ДАГАВОРАЎ

ХАБАРАЎСК, 13 снежня (БЕЛТА).

Арыштаваны раней манчжурскай паліцыяй ч. в. а. начальніка дэпо ст. Аньда совецкі грамадзянін Макавецкі быў у далейшым вызвалены.

У пяперашні час ім атрымана і прадстаўлена ў кіраўніцтва дарогі рашэнне пракурора манчжурскага суда ад 5-га снежня, у якім пракурор указвае, што нібыта Макавецкі—совецкі начальнік дэпо—прыцягваўся да судовай адказнасці па скарзе Гао Чэн-ху—манчжурскага начальніка дэпо.

У пастанове пракурора ўказана, што Гао Чэн-ху «назначан манчжурскім кіраўніком КУЧ».

Такім чынам пракурор афіцыяльна прызнае існаванне на КУЧ якогасці другога манчжурскага «кіраўніка», апрача законнага кіраўніка т. Рудага. У сувязі з гэтым генконсул СССР т. СЛАВУЦКІ 12 снежня паведаў дыпламатычнага агента Шы Люй-бэня і ўказаў, што ён не дапускае думкі, каб пракурор манчжурскага суда не ведаў існуючых даных аб КУЧ, згодна якіх на КУЧ існуе толькі адзін совецкі кіраўнік.

Тав. СЛАВУЦКІ ЗАЯВІЎ ЭНЕРГІЧНЫ ПРАТЭСТ, настойваючы на тэрміновым высвятленні пытання і прадстаўленні тлумачэнняў. Шы Люй-бень абяцаў расследаваць пытанне.

ПЕРШЫЯ АБОЗЫ З ДРОВАМІ ПРЫБЫЛІ У МЕНСК

Арганізаваць калгаснікам пролетарскую сустрэчу!

Учора, у 3 г. дня, у Менск прыбылі першыя абозы калгасных фурманак з дровамі. 20 фурманак прышлі ад сельсавету МЕНСКАГА РАЁНА, 62—ЗАСЛАЎСКАГА РАЁНА. Для таго каб зберагчы калгасных коняй, дровы былі разгружаны на ўкраіне горада ў раёне Старажоўкі. 50 ФУРМАНАК БЫЛІ АДРАЗУ РАЗДАНЫ РАБОЧЫМ ЗАВОДА «БЕЛАРУСЬ», якія мелі на руках талоны. Рэшта была раздана рабочым-адзіночкам таго-ж раёна.

Трэба сказаць, што рабочыя завода «Беларусь» аказаліся на вышыні. Не гледзячы на тое, што завод не быў папярэджан аб прыбыцці калгаснікаў, СТАЛОЎКА ЗАВОДА ЗАБЯСПЕЧЫЛА 65 ЧАЛАВЕК АБЕДАМІ. РАБОЧЫЯ ЗАВОДА ВЕЛЬМІ ЩЕПЛА СПАТКАЛІ КАЛГАСНІКАЎ, гутарылі з імі, расказвючы аб часовых труднасцях з дровамі, якія мы адзом зараз у Менску.

Учора-ж Менгарсовет атрымаў ад паведамленняў АБ ВЫХАДЗЕ АБОЗАЎ З ДРОВАМІ. Упаўнаважаны гарсовета тав. САРОКІН паведаміў, што з КАРАЛІШЧАВІЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА ВЫШЛА 55 ФУРМАНАК. Старшыня Замастоцкага сельсовета т. КАЛІНОЎСКІ паведаміў аб выхадзе 75 ФУРМАНАК. Старшыня Абчацкага сельсовета тав. КЛЕЎКО арганізаваў ЧЫРВОНЫ АБОЗ З ДРОВАМІ. Сакратар Папярнянскага сельсовета паведаміў аб выхадзе 50 ФУРМАНАК. Старшыня Крупіцкага сельсовета тав. ГЛАДКІ паведаміў, што нарады ўсім размеркаваны, масавая работа праведзена і абяцаў поўнасцю выканаць заданне партыі аб вывазцы дроў.

Учора ў гарсовеце было прынята рашэнне НАКІРАВАЦЬ УСЕ ФУРМАНКІ З ДРОВАМІ З ЧЭРВЕНЯ НА ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў РАЁНЕ ЛЯХАЎКІ. Арганізацыі і рабочыя заводаў «Большэвік», імя Варашылава, «Чырвоная зара», спіртаводачнага, фабрык імя Крупскай, «Комунарка», ЦЭЦ, завода «Комунар» павінны РАСПРАЦАВАЦЬ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА НАЛАДЖАННЮ ПРОЛЕТАРСКАЙ СУСТРЭЧЫ КАЛГАСНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ, ЯКІЯ ПРЫЕДУЦЬ З ДРОВАМІ.

СЁННЯ гэтаму пытанню будзе прысвечана нарада СТАРШЫНЬ ФАБЗАЎКОМАЎ І ЗРК вышэйпаказаных прадпрыемстваў, якая склікаецца ў пакоі № 3 ЦСПСБ (Дом працы, Пляц Волі, у 7 г. веч.). На гэту-ж нараду павінны з'явіцца ўсе адказныя за дастаўку і размеркаванне дроў.

***

Капі падвозка дроў гужам пачала наладжвацца, дык СПРАВА З АРГАНІЗАЦЫЯЙ ПАДВОЗКІ АЎТАТРАНСПАРТАМ УСЁ РАВНЭ СТАІЦЬ НА АДНЫМ ПУНКЦЕ. Ніяк нельга даведацца, колькі машын штодзенна выяжджае за дровамі, колькі рэйсаў яны робяць. Упік работы аўтатранспарта, за які адказвае гарадскі совет, да гэтага часу не наладжан. Установы і прадпрыемствы, якім дровы дастаўляюцца машынамі, павінны былі паведамляць штодзенна гарсовету аб рабоце аўтатранспарта. Аднак, УСТАНОВЫ ГЭТЫХ ВЕСТАК НЕ ДАЮЦЬ.

Учора НА НАРАДЗЕ ПРЫ ЦСПСБ было пастаноўлена для арганізацыі больш дакладнага кантролю за работай аўтатранспарта ўстанавіць КРУГЛАСУТАЧНЫЯ ДЗЯЖУРСТВЫ НА ПЕРАЕЗДЗЕ ЗА ЗАВОДАМ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА (у па мяшк. ўчдора № 711). Адказнасць за арганізацыю дяжурстваў ускладзена на т. т. БУДНІКАВА, ОСІПАВА і БАБРОЎСКАГА.

Адначасова на нарадзе было адзначана, што поўнай мабілізацыі транспарта САЮЗТРАНСА перашкаджае навыканалне старшынёй менгарсовета тав. КАРАНЕЎСКІМ даручення ЦК аб замене грузавікоў, якія працуюць на разгрузцы чыгуначнага вузла, ГУЖТРАНСПАРТАМ.

***

ПАДВОЗКА ДРОЎ ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРТАМ КРЫХУ ЎЗМАЦНІЛАСЯ, АЛЕ ЗУСІМ НЕДАСТАТКОВА. За 14 снежня ў Менск прыбыла 111 вагонаў дроў, замест 109—13-га снежня і 79—12-га снежня. Чыгуначная адміністрацыя не выконвае задання ЦК аб штодзённай падачы для пагрузкі дроў па 150 вагонаў. Праўда 14-га снежня пад пагрузку было падана 140 вагонаў, але 13-га былі паданы толькі 93 ваго

Рашучы адпор скажэнням нацпалітыкі партыі

Паўтары гады таму назад пастановай ЦВК БССР Кондалаўскі раён, як населёны пераважна палякамі, рэарганізаван у польскі нацыянальны раён. З таго-ж часу і прысвоена раёну імя аднаго з лепшых прадстаўнікоў большэвіцкай гвардыі Фелікса Дзяржынскага.

У аснову гэтай рэарганізацыі пакладзены прынцыпы ленінскай нацыянальнай палітыкі. Абслугоўванне працоўных нацыянальных меншасцей на роднай мове, ідучае на сустрач узрастаючых матэрыяльных і культурных запатрабаванняў, разгорнутая работа па інтэрнацыянальнаму выхаванню забяспечваюць упяўненае іх у актыўную барацьбу за ажыццяўленне задач пабудовы бяскласнага сацыялістычнага грамадства.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б Дзяржынскі раён дасягнуў значных поспехаў у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Каля 70 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы. Калгасы абслугоўваюць 2 МТС Дзяржынская і Путчынская. Пры актыўным удзеле палітаддзела МТС калгасы умацоўваюцца арганізацыйна, гаспадарча і палітычна. Калі ў мінулым годзе з калгасных прыбыткаў прыходзілася на працадзень ад 3 да 5 кгр. збожжавых толькі ў 6 калгасах раёна, дык у гэтым годзе в такой вагой працадзня налічваецца 44 калгасы. Адзін гэты прыклад з наглядная пераканаўчасцю сведчыць аб вялікай эфектыўнасці працы ў калгасах, калі кіраўніцтва імі пастаўлена па-большэвіцку.

Па раёну шырока разгорнута сетка школ, клубаў, хат чытальняў і дашкольных устаноў. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў раёне існавала ўсяго толькі 27 школ, у якіх, як вядома, забаронена было выкладанне на мовах мясцовага насельніцтва (беларускай, польскай, яўрэйскай). Замест необходных навук перажавала начыненне дзяцячых галоў папоўскім дурманам. Зараз у раёне налічваецца 95 школ. З іх 16 ШКМ, 1 ФЗС і 1 дасяцігодка. 81 школа працуе на польскай мове. Горад Дзяржынск ператворан у культурны раённы цэнтр.

Аднак, кіруючыя партыйныя, совецкія і прафсаюзныя арганізацыі Дзяржыншчыны дапусцілі сурёзныя недахопы і скажэнні ў практычным ажыццяўленні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Перш за ўсё аварачае на сябе увагу тое становішча, што за гэты даволі значны час пасля рэарганізацыі раёна ў польскі нацыянальны вельмі слаба пастаўлена абслугоўванне польскага насельніцтва на роднай мове. Раённыя ўстановы пры выстарчальным укамплектаванні партыйным і совецкім кадрамі з нацыянальнай амаль усю работу вядуць на беларускай мове. Такое-ж становішча ва ўсіх нацыянальных сельсоветах. Кіруючымі арганізацыямі раёна не звернута належная увага на вылучэнне і выхаванне большэвіцкіх кадраў з рабочых і калгаснікаў палякаў. З дзесяці польскіх нацыянальных сельсоветаў толькі ў пяці (Паланевіцкі, Новасёлкаўскі, Рубіляўскі, Фанпольскі і Нагарэльскі) старшыні палякі. Яшчэ горш справа з карэнізацыяй у калгасах. І гэта ўсё не таму, што ў раёне няма самаадданых сацыялістычнаму будаўніцтву актывістаў па лініі, здольных па-большэвіцку працаваць у кіруючых органах. Справа не ў гэтым, а ў тым, што ў раёне мае месца недаацэнка карэнізацыі апарата нізавых кіруючых звенняў, недаацэнка падрыхтоўкі і выхавання большэвіцкіх польскіх кадраў. Характэрна, што раённае кіраўніцтва нават не паслала на курсы падрыхтоўкі работнікаў сельсоветаў пры ЦВК БССР патрэбнай колькасці людзей. Замест 10 чал., вызначаных па развёрстцы раёну, на курсах вучыцца толькі 3 чалавекі.

Грубыя скажэнні лініі партыі маюць месца і ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. У радзе школ (Новасёлкаўская, Путчынская, Натчанская, Вялікаўская, Старынкаўская і інш.) налічваецца па 20-30 дзяцей палякаў. Аднак, ні ў адной з такіх 18 школ няма груп, якія навучаліся-б на польскай мове. У асобных школах, як напрыклад, Новасёлкаўская, нават не ўведзена выкладанне польскай мовы, як прадмета.

Яшчэ горш справа па абслугоўванню на польскай мове пастаўлена ў дашкольных установах. З 98-мі існуючых у раёне дашкольных устаноў толькі 8 працуюць на польскай мове, адна на яўрэйскай, адна на рускай, а астатнія 88 — на беларускай.

Малатлёжная літаратура на польскай мове нават выпрэслена культпропам РК з развёрсткі. Ні аднаго экземпляра гэтай літаратуры ў раёне не знойдзеш. Для арганізацыі работы распаўсюджвання газет і часопісяў на польскай мове ў раён прыслан з рэдакцыі «Трыбуна Радзецка» спецыяльны чалавек. Гэты таварыш на працягу чатырох дзён абязаў парогі культпропа райкома, райвіка, РК комсомола і пошты і не дабіўся, каб вылучылі яму ў дапамогу па 1-2 чал. з гэтых арганізацый. Ён выехаў пралазаць у сельсовет адзін, а раённыя арганізацыі, як відаць, лічаць гэтую справу лішняй. Праўда, культпропам РК Кучынскі, відаводна для «апытчання свайго сумлення» 2-3 дні таму назад напісаў дырэктыву ў ячэйкі, каб разгарнулі працу.

Паданыя факты рэчаіснасцяў адносін да абслугоўвання працоўнага польскага насельніцтва на роднай мове, якое складае ў раёне звыш 70 проц., гавораць за тое, што ў раёне няма выразнага праяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі, **няма рашучай барацьбы супроць замаскаванага беларускага нацыяналізма, супраціўлення якога безумоўна мае праяўленнеў рабоце асобных звенняў кіруючых раённых арганізацый.**

Некаторыя кіруючыя работнікі раёна не зразумелі пастановы апошняга пленума ЦК КП(б)Б па нацыянальнаму пытанню. **Не правільна зразумелі новую большэвіцкую ўстаноўку барацьбы на два фронты і галоўнай небяспекі.** Вялікадзяржаўны шавінізм па-ранейшаму застаецца галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага Саюза. Але факты ўмоцненай за апошнія гады актывізацыі контр-рэвалюцыйнай беларускай нацдэмаўшчыны, факты сувязі іх з заходня-эўрапейскімі інтарвентамі ў імкненнях адарваць БССР ад Совецкага Саюза і ператварыць яе ў калонію імперыялістаў вымагаюць **сканцэнтраваць галоўны агонь па мясцоваму беларускаму нацыяналізму, які ў даны момант ва ўмовах БССР прадстаўляе галоўную небяспеку.**

Гэту зусім ясную ўстаноўку рэдактар раённай газеты Кірштэйн на пленуме РК КП(б)Б тлумачыў ва свой, му. Ён заявіў, «па колькі ва ўмовах БССР галоўнай небяспекай з'яўляецца мясцовы беларускі нацыяналізм, значыць у Дзяржыншчыне, як у польскім нацыянальным раёне, галоўную небяспеку прадстаўляе польскі шавінізм».

Да чаго вядзе такая трактоўка пытання? Яна вядзе да замаскавання сутнасці небяспекі мясцовага беларускага нацыяналізма, да паслаблення барацьбы з гэтай агентурай польскай дэфензывы і гітлераўскага фашызма, якая (агентура) рука аб руку дзейнічала з вялікадзяржаўнымі шавіністамі і ўкраінскімі нацыяналістамі ў сваіх імкненнях ажыццявіць планы інтэрвентаў. Пленум РК КП(б)Б рашуча адхіліў няправільнае выступленне Кірштэйна і даў гэтаму выступленню належную палітычную ацэнку. Вядома ўстаноўка, дадзеная пленумам ЦК КП(б)Б у пытанні барацьбы супроць мясцовага беларускага нацыяналізма, як галоўнай небяспекі ў сучасны момант, зусім не азначае паслаблення барацьбы супроць польскага, яўрэйскага і інш. шавінізмаў. Усялякае праяўленне шавінізма ёсць буржуазнае праяўленне, праяўленне дзейнасці класавага ворага. Ні ў якім выпадку нельга ўпушчаць з пад увагі, што ў Дзяржынскім раёне маюць месца праявы польскага шавінізма, спробы пры крыцця лозунгам «нацыянальнага адзінства», спробы змазаць класавыя супярэчнасці ўнутры нацыі.

У асобных калгасах («Орка», «Зара», «Чырвоны Кастрычнік») пад лозунгам нацыянальнага адзінства захоўваюцца злачынствы кулацкіх элементаў, што прыводзіць да гаспадарчага і палітычнага паслаблення гэтых калгасаў. Тое самае наглядаецца ў калгасах імя Фрунзе, «Будзённы» і «Профінтэрн» Нарэйкаўскага сельсовета. У калгасе «Профінтэрн» дагэтуль знаходзяцца класава-чужыя элементы, як напрыклад Валасевіч— уладар млына і эксплаататар наймовай рабочай сілы і інш. У калгасах імя Будзённага і «Праца», Нагарэльскага сельсовета, пад уплывам кулацкіх элементаў зусім развалена працоўная дысцыпліна.

Адсутнасць рашучай барацьбы супроць кулацкіх буржуазна-нацыяналістычных элементаў прыводзіць да зацяжкі выканання асноўных гаспадарча-палітычных кампаній. У часе загатоўкі насенных бульбы для Украіны «кулацкія элементы ў радзе калгасаў актыўна выступалі за зрыў гэтага мерапрыемства пад фальшыва-нацыянальным сцягам. Імкненна невыстарчальнай барацьбой з буржуазна нацыяналістычнымі элементамі тлумачыцца тое становішча, што Дзяржынскі раён у выкананні гаспадарча-палітычных кампаній не заняў месца сярод перадавых раёнаў БССР, а плянцыцца ў хвасце.

Задача дзяржынскай партыйнай арганізацыі шырока разгарнуць работу па растлумачэнню пастановы сне жанскага пленума ЦК КП(б)Б аб нацыянальным пытанні, узмацніць работу па інтэрнацыянальнаму выхаванню мас, вядучы бязлітасную барацьбу супроць буржуазных нацыяналістаў і шавіністаў розгала колера. Правільнае ажыццяўленне нацыянальнай палітыкі з'яўляецца магутнай зброяй умацавання пролетарскай дыктатуры, умацавання комуністычнага ўплыву на масы, выхавання іх у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, умацавання ўзаемнага даверя рабочых і працоўных мас розных нацый, умацавання іх адзінага фронта супроць эксплаататараў усіх нацый».

Брыгада «Звязды і нацкамісіі ЦВК Я. ІВАШЫН, ХІЛЬКЕВІЧ, ЖЫБЕНАС, ЮНКУР.

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКАЕ СУПРАЦІЎЛЕННЕ НАДЗЯЛЕННЮ БЕСКАРОЎНЫХ КАЛГАСНІКАЎ ЦЕЛКАМІ

СУР'ЁЗНАЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ

(На ўсебеларускай радыёпераклічцы)

Усе раёны БССР спухалі 13 снежня радыёпераклічку аб надзяленні бескароўных калгаснікаў цёлкамі, якая праводзілася ЦК КП(б)Б.

Ля мікрафона радыёстанцыі камісія ЦК КП(б)Б у складзе старшыні ЦВК СССР і БССР тав. ЧЭРВЯКОВА, загадчыка арганізацыі ЦК КП(б)Б тав. КАРТУКОВА, нач. палітсектара Наркамзема БССР тав. РАТНЕКА, наркома земляробства БССР тав. БЕНЕКА, нам. наркома тав. СТРЭЛЕ і інш.

Тав. Чэрвякоў ва ўступным слове падкрэсліў, што праводыр нашай партыі і рабочага класа тав. СТАЛІН на ўсесаюзным злёце калгаснікаў-ударнікаў заявіў аб тым, што праз 2-3 гады кожны калгаснік у Совецкім Саюзе будзе мець карову. Гэта мерапрыемства з'яўляецца адным з важнейшых у барацьбе за большэвіцкія калгасы, за заможнага калгасніка.

Зрозумелая рэч, што такая заява нашага вялікага правадыра абавязвае все партыйныя і совецкія арганізацыі СССР, а Совецкай Беларусі ў першую чаргу, зрабіць усё, каб выканаць гэтую дырэктыву.

Вы ведаеце, кажа т. Чэрвякоў, што тав. Сталін сказаў — «слова большэвіка моцнае слова». Калі тав. Сталін рабіў сваю заяву, ён выказаў упэўненасць у тым, што на мясцах пасля гэтага пачнецца сапраўдная большэвіцкая барацьба, каб яшчэ больш замацаваць нашы калгасы, зрабіць іх сапраўды большэвіцкімі, каб кожны калгасны двор меў сваю карову.

Як-жа раёны БССР выконваюць гэтую важнейшую пастанову партыі і ўрада?

Старшыня камісіі тав. Чэрвякоў прадстаўляе слова Мазырскаму раёну.

Загадчык мазырскім земельным аддзелам т. РАДЗІВІНОВІЧ дакладвае што зроблена для надзялення бескароўных калгаснікаў.

— У Мазырскім раёне 795 бескароўных — 10 проц. усіх калгасных двароў. Паводле плана прадугледжвалася закантрактаваць у калгаснікаў і адналасобнікаў 600 цёлак, закантрактавана-ж усяго тры. Мы склікалі нарады старшынь калгасаў... некаторыя недаацэньваюць важнасць гэтага мерапрыемства...

— А вы самі ацанілі важнасць гэтай работы? — пытаецца ў дакладчыка тав. Картукоў.

Прыведзеныя лічбы з'яўляюцца лепшым адказам на запытанне тав. Картукова. Мазырскія раённыя арганізацыі і райземаддзел у першую чаргу на працягу трох месяцаў ігнаравалі дырэктыву ЦК і СНК. На справе у Мазыры не вялося ніякай растлумачальнай работы. Закон аб льготах зусім не папулярызаван сярод калгаснікаў і адналасобнікаў. Характэрна, што тры адналасобнікі, якія закантрактавалі цёлак, дагэтуль не атрымалі ніякіх льгот.

Ля мікрафона КЛІМАВІЦКІ раён. Клімавічы зрываюць важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі. Правальваюць і недазяленне бескароўных цёлкамі. У раёне 300 бескароўных калгаснікаў. За апошнюю дэкаду па раёну закантрактавана ўсяго толькі чатыры цёлкі. Гэтая лічба паказвае на тэмпы работы.

Партыйнае кіраўніцтва раёна замест таго, каб разбіць кулацкае супраціўленне надзяленню бескароўных цёлкамі, патурае яму. Гэта станавіцца ясным з першых-жа слоў старшыні калгаса «Ленінскі шлях» тав. Майсевенка.

— У нас у калгасе, — гаворыць Майсевенка, — 13 бескароўных. Надзялем цёлкамі 5. Астатніх надзяляць не будзем, бо, яны разбазарылі сваіх кароў да ўступлення ў калгас.

Гэтая «устаноўка», якая супярэчыць дырэктывам партыі і ўказанням тав. СТАЛІНА аб тым, што нельга помсціць тым калгаснікам, якія па сваёй несвядомасці паддаліся кулацкай агітацыі, падтрымліваецца і раённым кіраўніцтвам. Таму зусім не выпадкова тое, што па Клімавіцкаму раёну надзяленне бескароўных цёлкамі ганебна зрываецца.

Тав. Чэрвякоў дае слова старшыні Мсціслаўскага РВК тав. МАРОНУ.

Тав. Марон адразу-ж пачынае з падвойнай бухгалтэрыі.

— Па папярэдніх падліках, — кажа ён, — у нас было 817 бескароўных. Пасля пастановы СНК па майму дакладу высветлілася, што падлягаюць надзяленню каровамі 431 гаспадарка. Астатнія гэта тыя, якія раз базарылі сваіх кароў і надзяленню не падлягаюць...

Гэтая арыфметыка Марона адразу-ж выкрываецца тав. Чэрвяковым.

— Вы пазбаўляеце права на набыццё цёлак тых калгаснікаў, якія разбазарылі сваіх кароў да ўступлення ў калгасы — падкрэслівае тав. Чэрвякоў. Усе мы ведаем, што такая справа была, але ўсё-ж такі яны запаз калгаснікі, а некаторыя з іх і ўдарнікі. Нужо-ж за тое, што яны па сваёй несвядомасці ў свой час паддаліся кулацкай агітацыі трэба і зараз караць?

Партыя і ўрад нікому гэтага не дазволіць.

Далей камісія заслухоўвае яшчэ рад раёнаў, у тым ліку ПУХАВІЦКІ, ЛЕПЕЛЬСКІ, ЗАСЛАЎСКІ і інш.

Перакліч паказала, што пераважная большасць раёнаў БССР не змагалася па-большэвіцку за выкананне гэтай важнейшай задачы, пас таўленай перад намі партыяй, часта па-апортуністычнаму падыходзіла да вырашэння гэтага пытання. Класававораж ыя элементы скарысталі бяздзейнасць мясцовых арганізацый для зрыву надзялення бескароўных цёлкамі.

Камісія ЦК КП(б)Б тут-жа была прымушана прыняць самыя рашучыя меры да тых кіраўнікоў партыйных і совецкіх арганізацый, якія не здолелі змагацца за большэвіцкія калгасы за заможнае калгаснае жыццё.

Гэтае рашэнне павінна пастужыць сур'ёзным папярэджанням для ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый БССР.

Дырэктыва партыі і ўрада аб надзяленні бескароўных калгаснікаў цёлкамі павінна быць неадкладна выканана.

Г. Б.

Усю адказнасць усклалі на калгасы

МОЗЫР. (Ад нашага спец. кар.).

Мазырскія раённыя арганізацыі лічаць ніжэй свайго гонару займацца арганізацыйнай дапамогі бескароўным калгаснікам.

Яшчэ 3-га верасня Мазырскі райком КП(б)Б, абгаварыўшы пастанову СНК і ЦК аб надзяленні бескароўных калгаснікаў цёлкамі, дастаўны на правільны шлях, пастанавіў:

«Закупку, кантрактацыю цёлак для бескароўных калгаснікаў ускласці цалкам на праўленні калгасаў, абавязаўшы старшынь сельсоветаў, загадчыка райза і жыццёла аб'яднання... аказваць калгасам дапамогу».

І вось на падставе гэтай пастановы райземаддзел і райжывёлаб'яднанне лічаць, што ім трэба толькі «кіраваць» гэтай справай, што-ж датычыць арганізацыі работы непасрэдна ў калгасах і сельсоветах, гэта ўжо іх не датычыць.

Калі мы спыталіся кіраўніка райжывёлаб'яднання: як-жа ў раёне ўсё-ж выконваецца план, — кіраўнік аб'яднання тав. Казлоў адразу падаў нам тры лічбы: атрымалі цёлак 8 гаспадарак, а можа 15, а можа і 21. Бачыце, — кажа тав. Казлоў, — гэта-ж не наша справа. Статыстыка райза мусіць лепш ведае.

Зоатэхнік райземаддзела Абрамовіч паказвае нам даведку аб тым, што маркуецца з абагуленага стада выдаць бескароўным 200 цёлак, а закупіць і закантрактаваць 600 цёлак, усяго 800.

— А як гэты план выканан?

Ніадаўа Мазырскі райком партыі зноў абгаварыў гэта пытанне і адзначыў, што з абагуленага стада перадана калгаснікам 28 шт., або 4 проц. Закуплена і закантрактавана ўсяго толькі 5 цёлак.

У Даманавіцкім сельсавеце 75 бескароўных калгаснікаў. Дагэтуль ні адзін бескароўны цёлкі не атрымаў. Такое-ж становішча ў Зеляноцкім, Бравіцкім і Крупавіцкім сельсоветах раёна.

Ніякай масавай работы вакол гэтага важнейшага мерапрыемства партыі і ўрада ў раёне не вядзецца. А гэта скарысталі класава-варожыя элементы, якія пусцілі чуткі аб тым, што бескароўным дадуць не цёлак, а дойных кароў з абагуленага стада. Не зважаючы са праўшнага становішча рэчаў, некаторыя калгаснікі паддаліся на гэту кулацкую выдумку. У калгасе «Камінтэрн», Бабрынецкага сельсовета, бескароўныя калгаснікі ад мовіліся браць цёлак.

Гэта-ж самае мела месца ў калгасах Даманавіцкага сельсовета і ў калгасе «Рухавік рэволюцыі», Крупскага сельсовета.

23 лістапада бюро райкома зноў выпесла пастанову па гэтаму пытанню і даручыла агітпрасу тав. Здановічу і загадчыку райземаддзела т. Радзівіновічу накіраваць з партактыва 10 гаварышоў для правядзення злётаў бескароўных калгаснікаў для ўзмацнення растлумачальнай работы сярод адналасобнікаў, маючых цёлкі.

Але дагэтуль куставыя злёты яшчэ не склаліся, вылучаныя работнікі ў калгасы не выязджалі.

Вось як на Мазырыччыне свядома зрываюць выкананне баявога задання партыі і ўрада.

Ул. Мачальскі.

КУЛАЦКАЯ АГІТАЦЫЯ НЕ СУСТРАКАЕ АДПОРА

УКАРАВІЧЫ. (Наш кар.).

Класава-варожыя элементы ў цалым раёне сельсоветаў раёна на пырваюць чуткі аб тым, што не трэба браць кредыты, не трэба браць цёлак, бо як толькі бескароўныя калгаснікі атрымаюць цёлкі — іх адразу трэба будзе здаваць дзяржаве малако і мяса.

Гэтай кулацкай агітацыі ніхто не дае адпора. Выпачаны кредыт у колькасці 8 166 руб. не выкарыстан. Даныя ўрадам ільготы не растлумачаны. Бескароўныя калгаснікі цёлак не атрымалі.

Калгасы «Авангард», «Рухавік», «Вольная праца» і інш. павінны былі перадаць бескароўным цёлак са сваіх МТФ, але і па гэты дзень ні адна цёлка не перадана. Калгасы «Чырвоны шлях», «Дняпро» «1 мая», якія павінны былі перадаць цёлкі калгаснікам з МТФ, пакуль што перадалі ўсяго толькі па адной цёлцы. Яшчэ горш справа з закантрактаваным цёлакам.

Калгас імя Энгельса павінен быў закантрактаваць 24 цёлкі — не закантрактавана ні адна. Калгасы «Камінтэрн», «Ударнік, пяцігодка», «Чырвоная Плошча», «Чырвоная ліпа», «Дружба», імя Будзённага павінны закантрактаваць па 22 да 15 цёлак. Пакуль што не закантрактавана яшчэ ні адна цёлка.

Укаравіцкі раён з'яўляецца буйным жывёлагадоўчым раёнам. Патрэбныя 344 цёлак для надзялення бескароўных можна лёгка знайсці непасрэдна ў раёне. Але ўся справа ў тым, што Укаравіцкі РВК РВК нічога канкрэтнага ў гэтым напрамку не зрабілі. **А. Казімір.**

АБАРАНЯЮЦЬ „ГОНАР МУНДЗІРА"

Партыяй і ўрадам быў вызначан рад канкрэтных мер па ліквідацыі бескароўнасці і падзялення бескароўных цёлкамі. Бескароўным дзяржава аказвае дапамогу выдачай кредыта тэрмінам на год.

Для Менскага раёна адпушчана 30,8 тыс. рублёў кредытаў для выдачы бескароўным.

Аднак, ход скарыстання кредытаў калгасамі Менчыны па-большае цёлак паказвае, што гэта важнейшае мерапрыемства па Менскаму раёну зрываецца. На 20 лістапада калгасамі скарыстана ўсяго толькі 9.735 руб. кредытаў, або 31 проц., прычым непасрэдна па калгаснікаў не перапісан ні 1 руб.

Адной з прычын нескарыстання кредытаў з'яўляецца тое, што менскі райземаддзел падышоў да гэтай справы бюракратычна. Пры размеркаванні кредытаў зусім не ўлічвалася фінансавая моцнасць асобных калгасаў. Райземаддзел механічна размеркаваў кредыты паміж усімі калгасамі і раздрабіў іх. Так, напрыклад, калгасу «Чырвоны бацэ», Пакалюбскага сельсовета, па набыццё цёлак адпушчана 33 рублі кредыта, калгасу «Свабода», Трасцянецкага сельсовета, 22 руб., калгасу імя Молатава, Кайкаўскага сельсовета, таксама — 22 руб. і т. д.

Ёсць выпадкі, калі кредыт вызначыў такім калгасам, дзе зусім няма бескароўных (калгасы «Ільіч» і «Краіна Совецкая», Крупскага сельсовета).

Менскаму галземаддзелу было ўказана на гэтыя памылкі і прапанавана іх выправіць. Але работнікі земаддзела, абараняючы «гонар мундзіра», упарта настойваюць на сваім.

Мы патрабуем каб ГБК-РСІ прыцягнула да адказнасці вінаватых у зрыве гэтай важнейшай справы.

Л.

А. ДЖЭЛЮК, А. ІОФФЕ

АЧЫСЦІЦЬ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ ад НАЦДЭМАЎСКАГА ХЛАМА

Беларускія нацыянал-дэмакраты ў сваёй барацьбе супроць дыктатуры пролетарыята ўжывалі ўсе сродкі аж да шпіянажа на карысць імперыялістычных дзяржаў і шкодніцтва ва ўсіх галінах гаспадаркі і на вуцы. Асабліва шырока нацдэмы «папрацавалі» ў галіне гісторыі. Фальсіфікацыяй, падгасоўваннем гістарычных фактаў, выдумкамі і хлусвёю яны імкнуліся паказаць гісторыю Беларусі і рэволюцыйнага руху ў выгодным для сябе выглядзе, каб цавесці асаблівую «самабытнасць» беларускага народа.

Гэта «навуковая» работа нацдэмаўскіх «гісторыкаў» палягчалася для іх вельмі часта аслабленнем рэволюцыйнай пільнасці, а часамі нават простым падтрыманнем з боку пасобных рэдактароў-комуністаў.

Многія члены партыі — гісторыкі ў сваёй навуковай рабоце карысталіся нацдэмаўскімі ўстаноўкамі, не жадаючы нават разабрацца ў гісторыі Беларусі, не ўмеючы адрозніць марксісцкі аналіз гістарычных фактаў ад нацдэмаўскага. Вольна або мімавольна гэтыя комуністы самі ўпадалі ў нацдэмаўшчыну.

КП(б)Б заўсёды вяла бязлітасную барацьбу з нацдэмаўшчынай і яе апяжунамі — нацыянал-ухілістамі ўнутры партыі. Гэта барацьба павінна быць цяпер ва многа раз узмоцнена ў сувязі з тым, што на цяперашнім этапе ва ўмовах Беларусі мясцовы нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтервентамі, з'яўляецца галоўнай небяспекай. Трэба з усёй рашучасцю і бязлітаснасцю выкрываць і выкарчоўваць рэшткі нацдэмаўшчыны на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і на ўчастку павукі.

Мы ўжо ўказалі, што з асаблівай старанпасцю нацдэмы скажалі гісторыю Беларусі. Не прапусцілі яны нават і совецкіх энцыклапедый, выданых у Маскве. Вазьміце БСЭ і МСЭ і ЛЭ. У гэтых энцыклапедыях артыкулы аб Беларусі — гэта сушальны нацдэмаўскі хлам.

Шмат месца аддаецца ў гэтых артыкулах Кастусю Каліноўскаму, як «праваднру беларускага сялянства». У МСЭ (першае выданне) Кастусь Каліноўскі называецца «вядомым беларускім рэволюцыйным народнікам». У БСЭ Кастуся Каліноўскага называюць «арганізатарам чырвоных сялянскіх атрадаў» і г. д.

Гістарычная асоба Кастуся Каліноўскага ў некаторай ступені вы крыта ў марксісцкай гістарычнай літаратуры за апошнія некалькі год. Мы-б на ім не спыняліся, калі-б аўтары артыкулаў у энцыклапедыях не працягвалі «тэорыю» гістарычнай пераемнасці ад Кастуся Каліноўскага да КП(б)Б. Нацдэмаўскія аўтары стараюцца даказаць, што пераемнікам Кастуся Каліноўскага з'яўляецца Беларуская Сацыялістычная Грамада, а не раснікам БСГ з'яўляецца КП(б)Б. Такім чынам, выходзіць, што каро ні КП(б)Б цягнуцца да Кастуся Каліноўскага.

Па-першае, Кастусь Каліноўскі не быў ні народнікам, ні тым больш правадыром беларускага сялянства. Як удзельнік польскага паўстання, ён у сваіх імкненнях не ішоў далей буржуазна-нацыяналістычных планаў усіх удзельнікаў гэтага паўстання. Польскае паўстанне 1863 года на тэрыторыі Беларусі знайшло вокгукі толькі сярод дробнай шляхты і дробна-буржуазных элементаў гарадоў, і на беларускія сялянскія масы ўплыва амаль не мела.

Сялянскія хваляванні ў Беларусі 1861-63 г. г. былі адказам на рэформу 1861 года, у рэзультаце якой беларускія сяляне атрымалі галотныя надзелы. Сялянскія хваляванні таго часу былі не вокгукам на польскае паўстанне, а былі накіраваны супроць «сваёй» шляхты і паноў, уладаўных на тэрыторыі Беларусі ўчасткамі зямлі ў тысячы і дзесяткі тысяч дзесяцін кожны. І да гэтых хваляванняў Кастусь Каліноўскі ніякіх адносін не меў.

У перыяд польскага паўстання ў беларускай вёсцы актыўна працавалі гурткі зямлявольцаў, і калі можна гаварыць аб якім-небудзь рэволюцыйным уплыве на беларускае сялянства, то гэта быў уплыў зямлявольцаў, але ні ў якім разе не Кастуся Каліноўскага.

Навошта патрэбен нацдэмам Кастусь Каліноўскі з'яго ароолам рэволюцыйнага героя? Для таго, каб даказаць, што толькі ў польскім паўстанні ляжыць пачатак рэволюцыйнага руху ў Беларусі, што Беларусь «крывёю» звязала сябе з буржуазіяй і панамі Польшчы. Кастусь Каліноўскі — гэта гістарычны аргумант у руках нацдэмаў для затрадання сваёй арыентацыі на капіталістычны Захад. Задача комуністаў-гісторыкаў выкрыць і разбіць гэты «аргумант» да канца.

Аўтары артыкулаў у энцыклапедыях рысуюць Беларускую сацыялістычную грамаду, як арганізацыю рэволюцыйную і ледзь не марксісцкую.

«У 1905 г. БСГ кіравала рухам шырокіх мас; на чале яе стаяў своеасаблівы блок рэволюцыйнага народніцтва і марксістаў» (МСЭ, першае выданне). Хто гэтыя «марксісты»? Ільжевіч — зараз нацыянал-фашыст і які працуе на карысць польскіх дэфензывы, заклятых вораг беларускіх працоўных мас. І другія, да Ільжевіча падобныя.

Што з сябе прадстаўляла БСГ, якая ў 1905 г. нібыта кіравала рухам шырокіх мас? У 1905 годзе БСГ складалася галоўным чынам са студэнцкай моладзі—выхадцаў з радоў беларускай шляхты і кулакоў. У 1904-5 г. г. Грамада выпусціла некалькі пракламацый, напісаных у нацыяналістычным духу. Вось і ўвесь «марксізм» БСГ, вось усё яе «кіраўніцтва» рухам «шырокіх» мас.

Гэтыя беларускія «марксісты» ў 1906 г., калі пачалася рэакцыя, нават не адважваліся ў сваім праекце праграмы, прынятым на з'ездзе ў Менску, успомніць аб аўтаноміі Беларусі, г. зн. аб тым «каньку», на якім грамадаўцы звычайна выязджалі «ў народ». Гэтыя «народнікі» і «марксісты» ў перадавой першага нумара «Нашай нівы» (1906 год) пісалі «Не думайце, што мы хочам служыць толькі адным панам, або адным мужыкам. Не, ніколі. Мы будзем служыць усяму пакрыўджанаму беларускаму народу», г. зн. і беднякам, і кулакам, і буржуазіі, першым на словах, другім — на справе.

Аб тым, што гэта так, што на справе Грамада служыла толькі кулакам і буржуазіі, даказвае тое, што ў гады самай пёўнай рэакцыі «Наша ніва» прапазедвала ідэі стаўлыпінскай хутарызацыі і лічыла партыю кадэтаў «лепшым прадстаўніком дэмакратыі».

Вось як на справе выглядае Грамада ў гады рэволюцыі 1905 года, а потым у гады рэакцыі. Для чаго патрэбна нацдэмам фальсіфікацыя гісторыі 1905 года на Беларусі? Для таго, каб утаіць ад мас сапраўды рэволюцыйную работу ў 1905 годзе большэвіцкіх груп і арганізацый (Менск, Гомель, Віцебск і інш.), каб утаіць ад мас, што арганізатарамі сялянскіх хваляванняў у 1905 годзе былі рабочыя бліжэйшых прадпрыемстваў і сялянская моладзь, пабыўшая на заводах Масквы, Пецярбурга і ў шахтах Данбаса. Гэта фальсіфікацыя гісторыі 1905 года патрэбна нацдэмам яшчэ для таго, каб даказаць, што палітыка хутарызацыі, якая праводзілася Прышчэпавым, з'яўляецца воляй «шырокіх мас» і выражэннем беларускага «самабытнага марксізма».

«БСГ арганізавалася пасля лютаўскай рэволюцыі, кіравала франтавымі і сялянскімі з'ездамі ў Менску і па меры ўздыма рэволюцыйнай хвалі сама падавалася ўзмоцненай большэвізацыі» — так пішуць нацдэмаўскія «гісторыкі» ў МСЭ.

І гэта, як усё астатняе, з'яўляецца фальсіфікацыяй. На самой справе франтавымі сялянскімі з'ездамі кіравалі большэвікі: Мясніковаў, Фрунзе, Кворын і др.

Грамадаўцы-ж склікалі з'езды салдат-беларусаў, на якіх яны (грамадаўцы) заклікалі арганізоўвацца вакол «вялікай беларускай рады», створанай па патрабаванню Грамады на з'ездзе беларускіх арганізацый у Менску ў чэрвені 1917 года.

«Узмоцненая большэвіцкая Грамады» заключалася ў тым, што яны выказваліся за працяг вайны і пісалі ў сваёй газеце «Грамада» аб Керэнскім, як аб «лепшым прадстаўніку народа». Працоўныя масы ацанілі работу Грамады тым, што ні аднаго не прадстаўніка не выбралі ў Менскі Совет.

Гэта фальсіфікацыя патрэбна нацдэмам для таго, каб даказаць, што большэвізм у Беларусі ішоў сваімі «самабытнымі» шляхамі і што ён нічога агульнага не мае з большэвізмам рускім. Яны ў тойжа энцыклапедыі проста так і пішуць, што калі «блок народнікаў і сацыял-дэмакратаў — большэвікоў распаўся», г. зн. Грамада, то «на абломках яго стварылася комуністычная партыя Беларусі».

Вось як выглядае «гісторыя большэвізма» на Беларусі ў «Малой» і «Большой Советской» энцыклапедыях. Па гэтай «гісторыі» выходзіць, што шлях большэвізма на Беларусі гэта ёсць шлях Грамады.

Большэвізм вырас у бязлітаснай барацьбе з ухілам і скажэннямі марксізма-ленінізма. Большэвізм— міжнародная рэволюцыйная сіла. Большэвізм — гэта сцяг мільёнаў працоўных капіталістычных і каланіяльных краін у іх барацьбе за вызваленне. Вось чаму нацдэмы, каб утаіць ад працоўных мас сваю кулацкі, нацыяналістычны і контрэволюцыйны твар, прыкрываюць маскай большэвізма. Наша задача — гэту маску сарваць.

І ў галіне літаратуры, мастацтва і этнаграфіі нацдэмы-дэмакраты працавалі над тым, каб дазваць «самабытнасць» Беларусі. Гісторыя літаратуры, мастацтва, этнаграфіі, напісаная нацдэмамі, гэта — ад пачатку да канца фальсіфікацыя, мэта якой — развіццё сярод насельніцтва Беларусі шавінізма і арыентаваць яго на капіталістычны Захад.

З гэтага боку вельмі цікавым з'яўляецца твор ржанне «вучонага» Карскага, які ў рэзультаце поўгіх «прац» прыйшоў да такога заключэння аб адметных вонкавых уласцівасцях беларуса. «Па знадворнаму выгляду, — піша ён, — беларусы некалькі адрозніваюцца ад вялікарусаў і украінцаў: ён часцей за ўсё сярэдняга роста (якая дакладнасць! — **А. Д. і А. І.**), прыземлісты і не такі шырокі і плотны як вялікарус. У беларусаў пераважаюць светлыя, або светларусыя валасы, вочы ў іх часцей за ўсё блакітнага або шэрага колера... У беларусаў у найбольшай шырыні ўтрымаўся старажытны славянскі тып, так сказаць, цэнтра славянства, яны менш другіх падпарадкаваліся розным змешваннямі» (Карскі «Большая Советская энциклопедия»).

З гэтых радкоў чытачу не цяжка ўстанавіць расавую акрэсленасць беларусаў. Сучасны чытач лёгка можа супаставіць «тэорыю» расавасці Карскага і фашыстскую тэорыю Гітлера аб «чыстай арыйскай расе».

(Працяг будзе).

НАСЕННЕ—ЗАЛАТЫ ФОНД БУДУЧАГА ЎРАДЖАЮ

ДА XVII З'ЕЗДА ПАРТЫІ У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ І СОЎГАСЕ У ДОБРЫХ СВІРНАХ ПАВІННА ЛЯЖАЦЬ ГАТОВАЕ ДА СЯЎБЫ ПОЎНАЦЭННАЕ НАСЕННЕ

У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

Тры пекялічныя свірны ў калгасе «Гігант», Дабейскага сельсовета, запоўнены насеннем і страхавымі фондамі. У адным з іх ссыпта на поўнасцю 48,8 цэнтнераў аўса, у другім 27,5 цэнтнераў ячменю і ў трэцім 20,8 цэнтн. вікі. Усё насенне адсартаванае. Селекцыйнае насенне ільну ўсё здана дзяржаве.

Адказнасць за захаванне насення ўскладзена на кладаўшчыка Трутнева Федара. Гэтую адказнасць Трутнеў поўнасцю ачуває. Ён павінуе для насенфондаў лепшыя свірны. Кожная маленькая шчыліна забіта паляй і глінай. Кожны дзень Трутнёў іх правярае, каб мышы не пагрызлі.

Гэтыя факты кажуць аб тым, як Трутнёў даражыць кожным свірнткам, каб не згубілася дарэмна.

Насенне бульбы таксама добра захавана. Адказвае за не калгаснік Масько Павел—спецыяліст па захаванню бульбы. Кожную пяцідзённку Масько рэгулярна правярае забуртаваную бульбу, каб не пачала псавацца.

Добрыя якасныя насенне калгаса «Гігант» у надзейных руках.

9 сельсоветаў не пачыналі ссыпку

МСЦІСЛАЎЛЬ. (Ад наш. кар.).

Мсціслаўскі раён паводле плана павінен ссыпаць у насенныя фонды 326,3 тоны збожжавых і 8978 тон бульбы. На 10-е снежня ссыпана збожжавых усяго 37,3 проц., бульбы 78,2 проц.

Па шэсці сельсоветах— Курманаўскім (старшыня Шведаў), Малькаўскім (старшыня Маслоўскі), Пячонкаўскім (старшыня Сідарэнка), Ходасоўскім (старшыня Трыфіцкаў), і інш.—калгасы дагэтуль і не пачыналі ссыпаць насенных і страхавых фондаў.

Раённыя арганізацыі прабуюць апраўдаць вялы ссыпкі насенны тым, што яны заляты... ільназагатоўкамі. Нараўц-ці варта даказваць усю абгрунтаванасць гэтага «довада». Скажам толькі, што і апрацоўка ільну і загатоўкі таксама не арганізаваны.

А. Мароз.

ЗВОДКА АБ ХОДЗЕ ССЫПКІ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ ПА БССР

на 10 снежня ў процантах

Назва раёнаў	Збожжавыя	Ільнанасення	Бульбы	Назва раёнаў	Збожжавыя	Ільнанасення	Бульбы
Дрысенскі	60,7	66,7	74,5	Чэрыкаўскі	72,4	71,0	83,1
Полацкі	73,5	65,6	82,9	Крычаўскі	77,7	43,6	98,3
Лепельскі	51,5	36,3	89,1	Клімавіцкі	62,2	59,9	57,8
Асвейскі	49,5	34,8	60,5	Касцюковіцкі	92,3	59,9	80,5
Расонскі	67,8	45,4	95,5	Ч.-Польскі	61,7	—	65,5
Ушацкі	110,1	77,4	110,3	Кармянскі	138,2	62,4	74,6
Сіроцінскі	61,3	69,8	74,4	Рагачоўскі	—	—	—
Бешанковіцкі	50,3	70,7	92,8	Жлобінскі	84,8	54,0	66,0
Вышніцкі	36,3	74,4	85,5	Б.-Кашалёўскі	103,4	—	144,2
Крупскі	42,3	25,8	66,0	Уваравіцкі	52,9	55,1	60,1
Барадоцкі	54,2	76,5	80,5	Веткаўскі	73,9	21,4	64,8
Суражскі	63,2	59,1	72,7	Чачэрскі	50,0	26,4	86,8
Пёзненскі	60,7	55,1	85,9	Церахоўскі	115,7	118,3	103,9
Сенненскі	68,7	94,8	106,4	Старобінскі	89,3	—	102,9
Талачынскі	42,0	29,4	54,1	Любанскі	93,8	130,3	104,3
Бялыніцкі	100,6	79,9	93,6	Жыткавіцкі	66,5	34,1	78,2
Дубровенскі	66,5	77,8	78,9	Тураўскі	89,7	—	91,6
Горацкі	78,5	55,5	83,4	Лельчыцкі	85,0	71,7	71,4
Мсціслаўскі	37,3	47,5	78,2	Мазырскі	88,7	79,5	80,2
Чавускі	73,9	50,1	77,8	Парыцкі	110,4	4,8	112,7
Шклоўскі	87,9	23,0	101,1	Глускі	90,4	85,5	103,9
Бягомльскі	81,1	39,6	67,7	Пятрыкоўскі	60,5	83,2	71,1
Плешчаніцкі	79,7	24,3	69,1	Ельскі	66,6	56,4	69,6
Пагодскі	79,1	1,0	84,6	Нараўлянскі	52,5	39,6	50,7
Васілаўскі	78,4	71,2	96,2	Лоеўскі	106,2	72,6	79,8
Дзяржынскі	70,8	66,1	103,7	Брагінскі	79,7	23,9	88,1
Уздзенскі	82,6	47,7	110,1	Камарынскі	83,5	213,6	97,3
Капыльскі	39,1	41,3	80,5	Хойніцкі	95,0	113,6	129,3
Слуцкі	59,4	71,7	113,1	Менскі	83,0	41,8	111,4
Н.-Слабодскі	125,2	96,6	92,0	Бабруйскі	69,9	55,9	83,5
Карысаўскі	121,2	108,2	106,7	Гомельскі	118,2	83,0	127,0
Смалявіцкі	76,9	73,6	120,9	Магілёўскі	97,5	46,5	93,1
Пухавіцкі	27,1	19,4	12,9	Аршанскі	123,5	97,4	113,8
Ізяславскі	42,5	103,6	93,3	Віцебскі	94,8	84,0	103,7
Вілейскі	85,2	75,2	94,7				
Мядзёльскі	46,0	24,0	49,4				
Асіпавіцкі	54,2	40,2	86,4				
Ст.-Дарожскі	97,5	37,3	99,9				
Быхаўскі	83,8	58,8	72,9				
Крапіўскі	52,7	—	57,1				
				ПА БССР	72,8	59,4	82,9
				Было на 1-XII—33 г.	52,0	47,7	65,9

АРГАНІЗУЮЧАЯ РОЛЯ СЕЛЬСОВЕТА ІГНАРУЕЦЦА

(Ліст члена сельсовета)

УШАЦКІЯ раённыя арганізацыі недаацэньваюць ролю сельсветаў у арганізацыі кантрактацыі і вагі пёлак для бескароўных калгаснікаў.

Члены кантрактацыі былі спушчаны непасрэдна ў калгасы, мінуючы сельсветы.

Партыя і ўрад не раз адзначалі абавязкаецкі ўзмацніць арганізуючую ролі сельсветаў у справе дапамогі бескароўным калгаснікам у набыцці пёлак. А ў выніку апарту ністычнага ігнаравання сельсветаў ушацкімі раённымі арганізацыямі работнікам нашага МАЛАДАЛЕЦКАГА сельсовета прыходзіцца за вёсткамі па гэтаму пытанню бегаць у калгасы.

Справай арганізацыі дапамогі бескароўным калгаснікам у сельсавеце такім чынам ніхто не займаецца.

КАЛГАСНІК.

Класавы вораг пасягае на насенную бульбу

СУРАЖ (ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

— Як ідзе ссыпка насенных і страхавых фондаў?

— Ссыпаем. Калі ласка, зводачку — адказаў жвавы рахункавод калгаса «Шлях бедняка», Янавіцкага сельсовета, Смірноў.

Зводка паказвае: ссыпана 45 цэнтнераў аўса, 20 цэнтнераў пшаніцы, 1344 цэнтнеры бульбы, іншых збожжавых 73 цэнтнеры і праз трыер пра пушчана — 74 цэнтнеры (а якіх культур невядома). На паперы—усё ў парадку.

Янавіцкі сельсовет (старшыня Прылашкевіч), атрымаўшы ад кожна га калгаса па такой зводцы, склаў лічбу да лічбы, перапісаў, падпісаў і накіраваў весткі ў райзямаддзел, а апошні —у Менск.

Наколькі-ж адпавядаюць сапраўднасці гэтыя лічбы? Ці правяраў іх хто-небудзь?

Сакратар РК КП(б)Б тав. Аўдзейчыкаў адкрыта заяўляе:

— Ніхто ў раёне — ні райса, ні сельсоветы, ні ўпаўнаважаныя РК (інакш — куставыя партарганізатары) не ведаюць сапраўднага становішча ў калгасах.

Гэта верна. Трэба толькі дадаць: не ведае і РК КП(б)Б, а не ведаючы становішча на месцах не прымае ніякіх мер, каб насенныя і страхавыя фонды сапраўды ссыпаліся, каб весткі аб ссыпцы былі рэальнымі.

Калгас «Шлях бедняка» — буйней шы ў раёне. Летась сеялася: аўса 70 гектараў, ячменю — 19 гект., пшаніцы 23 гектары, ільну — 106 гектараў, бульбы — 72, гект., вікі — 84 гект., гароху — 20 гектараў. У наступным годзе будзе пасеяна не менш. Значыць, і насення трэба ссыпаць не менш, як на плошчу яравых, засеяную ў мінулым годзе.

Не так думаюць у калгасе. Тут лічаць, што пасеўны клін будзе зменшан, асабліва па ільну, прыбліз на палову. Невыпадкова таму ў зводцы аб ссыпцы насенных і страхавых фондаў насенне ільну зусім не фігуруе, хоць яго ў калгасе і дасталкова, нават ліпкі ёсць. Дастаткова ў калгасе і іншага насення, даўно ўжо намалочанага.

Рахункавод калгаса тав. Смірноў прызнаецца:

— Зводку склалалі... машынальна.

Гэта азначае: ніякіх насенных і страхавых фондаў не ссыпалі, а зводку запоўнілі, бо трэба-ж нешта паведаміць сельсовету.

Падобная-ж кулацкая практыка выяўлена і ў калгасе «Інтэрнацыянал», Янавіцкага сельсовета. У гэтым калгасе бульба пры буртаванні зусім не важылася, а вага вызначалася на вока. Зараз, пры размеркаванні бульбы па працаднях, пры адкрыванні буртоў «нечакана» аказалася: у буртах больш бульбы, чым ссыпалі туды. У буртах другой брыгады лічылася 94 цэнтнеры, пры размеркаванні аказалася... 142 цэнтнеры, гэта значыць, на 48 цэнтнераў больш.

Рахункавод калгаса Ронін тлумачыць гэта «страхоўкай». Летась, маў, паказвалі больш, аказалася менш. Сёлета зрабілі наадварот. Бес спрэчна, страхоўка кулацкая, яная па справе азначае штучнае зніжэнне ўраджайнасці бульбы.

Мала гэтага. Да насенной бульбы пацягнулася лапа класавага ворага. Ужо ўскрыта 5 буртоў з насеннай бульбай. Частка бульбы пакрадзена, а тая, што засталася ў адкрытых буртах, памерзла. Толькі адна злачынца — былая бандытка Лапіна Наталля — выкрыта. Складзен акт. Справа перадана следчым органам. На гэтым справа і кончылася.

Буры з насеннай бульбай дрэнна захоўваюцца, няма дакладнага ўліку колькасці яе. Усё гэта стварае рэальную пагрозу, што ў калгасе «Інтэрнацыянал» зноў можа не хапіць бульбы на сяўбу ў 1934 годзе.

Гэтыя два факты — сур'ёзны сігнал для Суражскага раённага партыйнага і савецкага кіраўніцтва. Там, дзе мы не арганізуем па большэвіцку ссыпку і захаванне насенных фондаў, там кулак прабуе зрабіць сваю шкодніцкую справу. **М.**

Пастановы апошніх пленумаў ЦК КП(б)У і ЦК КП(б)Б—у шырокія масы працоўных

Разгарнуць большэвіцкую прапрацоўку

Пастановы лістападаўскага пленума ЦК КП(б)У і снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б аб правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі з'яўляюцца важнейшымі партыйнымі дакументамі, Валнасць іх заключаецца ў тым, што яны барацьбу за пролетарскі інтэрнацыяналізм узнімаюць на яшчэ большую палітычна-прынцыповую вышыню.

Падкрэсліваючы, што вялікадзяржаўны рускі шавінізм праяўляе галоўную небяспеку ў маштабе ўсяго Савецкага Саюза і ўсёй ВКП(б), абодвы пленумы адзначылі, што гэта ніколькі не супярэчыць таму палажэнню, што ў асобных нацыянальных рэспубліках на даным этапе галоўны агонь павінен быць накіраван па мясцоваму нацыяналізму, які змыкаецца зараз з імперыялістычнымі інтэрвентамі.

Гэта новая фармулёўка цалкам і поўнасцю адпавядае таму становішчу, якое мы маем зараз на Украіне і Беларусі ў сувязі з актывізацыяй мясцовых буржуазна-нацыяналістычных элементаў і змыканнем іх з польскім і нямецкім фашызмам, з мэтай адарваць гэтыя рэспублікі ад Савецкага Саюза і ператварыць іх у калоніі імперыялістычных дзяржаў.

Вось чаму не аслабляючы ні на мінуту ўдараў па вылазкам вялікадзяржаўных рускіх шавіністаў, партыйныя арганізацыі КП(б)Б павінны канцэнтраваць зараз галоўны агонь супроць беларускага нацыянал-дэмакратызма і яго агентуры ў партыі—беларускага нацыянал-апартунізма.

Адпэтуль разгортванне работы па прапрацоўцы пастаноў пленумаў як сярод комуністаў, так і сярод шырокіх беспартыйных мас з'яўляецца вядзе нейшай задачай усіх партыйных арганізацый. Між тым работа ў гэтых адносінах яшчэ не разгарнулася нават у такіх буйнейшых пролетарскіх цэнтрах, як Менск, Віцебск і Гомель.

Зусім правільна і самакрытычна паступіла бюро Менскага гаркома партыі, калі ў сваёй пастанове аб ходзе прапрацоўкі запісала, што «большасць партканектыкаў і партыйных ячэек дагэтуль не разгарнулі сапраўднай большэвіцкай масавай работы вакол гэтых пастаноў». Для таго, каб зрабіць рашучы пералом у разгортванні глыбокай прапрацоўкі, бюро гаркома прымушала сваіх членаў да партканектыкаў асобных прадпрыемстваў.

Учора ўжо адбыліся адкрытыя партыйныя сходы па гэтых пытаннях на гарбарні «Большэвік» і заводзе імя Варашылава. Такія сходы трэба правесці на кожнай фабрыцы, заводзе, калгасе і саўгасе. Але ці можна абмежоўвацца толькі правядзеннем партыйных сходаў? Ні ў якім разе. Пастановы пленумаў павінны быць глыбока прапрацаваны ў сотцы партыйнай асветы, рабочых і калгасных палітшкołах.

— Ні аднаго комуніста, беспартыйнага рабочага, калгасніка, працоўнага селяніна — аднаасобніка і служачага не ведаючага аб рашэннях пленумаў ЦК КП(б)У і ЦК КП(б)Б—вось бясвы лозунг, пад якім павінна разгортвацца прапрацоўка.

Асноўная мэта прапрацоўкі — павышэнне рэволюцыйнай пільнасці партыйных арганізацый у адносінах вылазак класавага ворага, які прыкрываецца фальшыва-нацыянальным сцягам. У адказ на контр-рэволюцыйную дзейнасць буржуазных нацыяналістаў, якія змыкаюцца з імперыялістычнымі інтэрвентамі, трэба адказаць яшчэ большым згуртаваннем вакол комуністычнай партыі, яшчэ мацнейшым ударам па вялікадзяржаўнаму рускаму шавінізму, сканцэнтраваўшы галоўную ўвагу на барацьбе з беларускім буржуазным нацыяналізмам.

Пастановы пленумаў ухвалены аднадушна

Учора адбыўся адкрыты сход партыйнага калектыва завода «Большэвік». Даклад аб рашэннях лістападаўскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)У і снежаньскага пленума ЦК КП(б)Б аб нацыянальнай палітыцы зрабіў загадчык культпропа Менскага ГК КП(б)Б тав. Хейфец.

Па дакладу тав. Хейфеца выступілі рабочыя-комуністы і беспартыйныя, якія ўказалі на факты праяўлення беларускага, яўрэйскага, вялікадзяржаўнага шавінізму на заводзе.

Рабочыя (Бенімовіч, Мінкін і інш.) таксама ўказалі на тое, што парткалектыў завода мала аддае ўвагі пытанням інтэрнацыянальна га выхавання рабочых.

Агульны сход парткалектыва аднадушна ўхваліў пастановы пленумаў ЦК і ЦКК КП(б)У і ЦК КП(б)Б і даручыў бюро парткалектыва распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па разгортванню глыбокай прапрацоўкі рашэнняў пленумаў, а таксама па ўзмацненню інтэрнацыянальнага выхавання рабочых.

В.

***

Даклад тав. Гершона аб пастановах пленумаў ЦК КП(б)У і ЦК КП(б)Б па нацпытанню на партыйным сходзе завода імя Варашылава быў выслухан з вялікай увагай.

Выступаўшыя члены партыі і беспартыйныя цалкам ухвалялі пастановы пленумаў. Беспартыйны рабочы Жылінскі ўспамінае мінулае цяжкае жыццё рабочых нацменшасцяй.

— На чыгунку паляжаў і яўрэяў не прымалі. Памятаю, прышоў я прасить работы на чыгунцы. А мне першым пытаннем: «Вы якой нацыянальнасці»? Калі даведаліся, што я паляк, паследаваў кароткі адказ: «Для вас работы ў нас няма».

— Шырокія магчымасці адкрыла Окцябрская рэволюцыя для развіцця эканомікі і культуры ўсіх нацыянальнасцяй, — кажа тав. Жылінскі.—Але трэба нам усім быць больш пільнымі, каб класавы вораг не шкодзіў нашаму будаўніцтву.

Тав. Фрайман, расказваючы аб гэтым, як яго брата—рабочага буржуазнай краіны—збівала жандармерыя за рэволюцыйныя выступленні, указаў на неабходнасць узмацнення работы мопраўскай арганізацыі па інтэрнацыянальнай сувязі з зарубежнымі рэволюцыянерамі.

У аднадушна-прынятай рэзалюцыі сход поўнасцю ўхваліў пастановы пленумаў ЦК КП(б)У і ЦК КП(б)Б і заклікаў партарганізацыю да яшчэ большай пільнасці і ўзмацнення барацьбы з рознымі адхіленнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Пад гучныя воплескі сход паслаў прывітанні т. т. Сталіну, Касіору, Гікало.

У парадку падрыхтоўкі да 17-га партз'езда, у адказ на ліст тав. Гікало рабочыя абавязаліся выканаць заказы менскай �цЭЦ да 19 снежня, а таксама выпусціць звыш плана два токарных і 12 свідравальных варштатаў, адну камнядрабілку, 100 чыгуноў, 500 падкоў і 50 замкоў, 50 прасаў.

Д.

УРОКІ РАГАЧОЎСКІХ СПРАЎ

Сёння мы друкуем у нашай газеце пастанову ЦККК КП(б)Б і рэспубліканскай камісіі па чыстцы «Аб Рагачоўскіх справах». У чым сутнасць гэтых «спраў»? Сутнасць іх заключаецца ў тым, што былыя кіруючыя работнікі Рагачоўскага раёна — Еўсеенка, Жмырко і Мацко ў разультаце прытуплення партыйнай пільнасці давалі па пытанню зямляўпарадкавання няправільныя, па сутнасці кулацкія ўстаноўкі, скаціліся на шлях падтрымання кулакоў у іх барацьбе супроць калгасаў, супроць пролетарскай дзяржавы.

Чытачам «Звязды» павінна быць памятна карэспандэнцыя «Абаровцы прынцэпаўскай хутарызацыі», змешчаная яшчэ 21 ліпеня гэтага года. У гэтай карэспандэнцыі мы пісалі, што «паводле даных правяраннага ў чэрвені і ліпені кантрольнага абмера, выяўлен недасеў азімых толькі па трох сельсоветах на 15,6 проц., або 544 га, яравых на 12,1 проц.—985 га, а ўсяго недасеў складае 14,11 проц., або 1.029 га», што «самае характэрнае ў лініі Рагачоўскага раёна—гэта ўкненне быццамі лічбамі аб зямлі замаскаваць кулака, побач з калгасам захаваць прышчэпаўскі хутар, паставіць ад наасобны сектар у больш выгодныя ўмовы, чым калгас».

Рагачоўскі райза з ведама і санкцыі сакратара РК Еўсеенка, старшыні РКК Жмырко і старшыні РВК Мацко праводзіў у зямляўпарадкаванні яўна кулацкую лінію. Больш таго, як высветлілася ў разультаце расследвання ЦКК і рэспубліканскай камісіяй па чыстцы, старшыня РВК Мацко нават падпісаў цыркуляр, у якім у замаскаваным выглядзе прапануецца разбазарваць калгасныя землі ў карысць кулакоў. Гэты цыркуляр прапануе «адвесці таксама зямлю пад яравую сяўбу заможна-кулацкім гаспадаркам, выключаным з калгасаў, у колькасці 5 га ўсіх укытках пры наяўнасці запасных зямельных фондаў і неасвоеных земляў калгасамі ў гэтым годзе».

Пад відам «неасвоеных земляў» 47 га было адрэзана ад калгаса «Чырвоны прамень» і перадана кулакам, вычышчаным з калгасаў. Калгас «Інтэрнацыянал», Свержыцкага сельсовета, быў зямляўпарадкаван так, што каля 15 хутароў, маючых па 8-10 га кожны, засталіся са сваімі зямельнымі ўчасткамі ўнутры калгаснай плошчы. Гэтыя кулакі-хутаране расцягнулі сотні пудоў збожжа калгаса «Інтэрнацыянал».

Лінія Рагачоўскага РВК на тое, каб паставіць аднаасобнікаў у больш выгодныя ўмовы, сказалася ў радзе сельсоветаў раёна. Так, калгас «Чырвоны партызан», Старасельскага сельсовета, быў так зямляўпарадкаван, што большасць калгаснай зямлі знаходзілася на адлегласці 4-5 кілометраў ад калгаса. У разультаце змяншаўся кошт працадзён і запазлівалася своячасовае скончэнне сельгаспрацэс. Аднаасобнікі гэтага-ж сельсовета атрымалі па якасці лепшую зямлю на тэрыторыі самых вёсак.

Пры такім зямляўпарадкаванні, многім аднаасобным гаспадаркам, а ў асаблівасці кулакам-хутаранам было лёгка ўтаіць свае землі ад абкладання. Усяго было ўтоена ад абкладання 2.500 га.

У тым-жа цыркуляры за подпісам Мацко РВК «катэгарычна забараняе абрэзку земляў і гародаў у калгаснікаў і аднаасобнікаў, сядзібы павінны быць пакінуты ў размерах іх фактычнага ранейшага карыстання». Гэта значыць, што калі ў калгасніка прысядзібная зямлі «ранейшага карыстання» было паўтара-два га, то—не смець чапаць. Вось так член партыі Мацко выконваў зусім выразнае ўказанне партыі і ўрада аб тым, што прысядзібныя землі калгаснікаў не павінны перавышаць 0,5 га.

Такая яўна кулацкая палітыка не магла не прывесці да значнага недавыканання планаў веснавой сяўбы. Толькі па адной вёсцы Навасёлкі, Забалоцкага сельсовета, было недасеяна 37 проц. яравых. Такіх вёсак і калгасаў у раёне было шмат. Але Мацко гэта не турбавала. Не турбавала гэта і б. сакратара райкома Еўсеенка і старшыню РКК Жмырко. Замест таго, каб забяспечыць паспяховае завяршэнне сяўбы, яны пасылаюць рапарт аб паспяховым скончэнні веснавой сяўбы.

Страта класавай пільнасці ў партыйнай чуласці ў Еўсеенка, Жмырко і Мацко ў значнай меры вынікае з таго, што ў кіраўніцтве не было дастатковай крытыцыповасці ў выразнасці пытанняў. Асабістая дружба часта брала верх над партыйным доўгам.

Такое становішча ў кіраўніцтве прывяло да засмечанасці партыйнага і савецкага апаратаў. Так культпропам райкома працаваў Багдановскі — сын кулака, рэдактарам раённай газеты Парошын — сын буйнога кулака, старшынёй Сверженскага сельсовета класава-варожы элемент і г. д.

ЦК і ЦКК пры дапамозе новага кіраўніцтва Рагачоўскага раёна выкрыла ўсё тое, што скрывалася за прыгожымі рапартамі і дэкларацыямі рагачоўскага кіраўніцтва. Еўсеенка выведзен са складу ЦК КП(б)Б, зняты з работы сакратара Полацкага РК і яму абвешчана вымова. Жмырко знят з работы і выведзен са складу партканцэлярыі ЦКК. Мацко, — як указвае пастанова ЦКК і рэспубліканскай камісіі па чыстцы,—заслугоўвае выключэння з партыі, але, з прычыны прызнання ім сваіх памылак і асуджэння іх, зроблена папярэджанне, што ў выпадку паўтарэння падобных дзеянняў, ён паставіць слабе па-за радамі партыі.

Справа Еўсеенка, Жмырко і Мацко з'яўляецца яшчэ адным памінкам, што «рэволюцыйная пільнасць з'яўляецца той самай якасцю, якая асабліва неабходна цяпер большэвікам» (Сталін). Партыйныя арганізацыі павінны вынесці з гэтай справы той урок, што неабходна яшчэ больш рашуча і бязлітасна змагацца з малейшымі адхіленнямі ад лініі партыі, з сямейнасцю і кругавой парукай, што неабходна ў корані перасячы малейшае парушэнне большэвіцкай партыйнасці.

АБ РАГАЧОЎСКІХ СПРАВАХ

Пастанова ЦККК КП(б)Б і рэспубліканскай камісіі па чыстцы ад 3 снежня 1933 г.

Заслухаўшы паведамленне т. СУХАНАВАЙ аб выніках паўторнай чысткі т. т. ЖМЫРКО, ЕЎСЕЕНКА і МАЦКО, — прызнаць, што былое раённае кіраўніцтва Рагачоўскага раёна ў асобе сакратара РК т. Еўсеенка, старшыні РКК-РСІ т. Жмырко і старшыні РВК т. Мацко ў сваёй практычнай рабоце правяла прытупленне партыйнай пільнасці, у прыватнасці, па пытанню зямляўпарадкавання калгасаў была дана сельсветам яўна няправільная, па сутнасці кулацкая, устаноўка па адводу земляў вычышчаным з калгаса заможнікам, кулакам, дапушчэнне засмечанасці партапарата класава-чужымі элементамі.

Як вынік гэтага, па раду сельсоветаў зямляўпарадкаванне калгасаў праведзена такім чынам, што на тэрыторыі апошніх пакінута па 10 і больш хутароў аднаасобнікаў, па 8-10 га зямлі ў кожным (калгас «Інтэрнацыянал»). Прысядзібныя ўчасткі калгаснікаў складаюць ад 1,5 да 2 га зямлі на калгасны двор (калгас «13 год Кастрычніка»).

Кіраўніцтва раёна ў часе веснавой сяўбы стала на шлях яўнага «очко втирательства» і падмана цэнтральных кіруючых органаў, утойваючы сапраўднае становішча ходу сяўбы.

РКК-РСІ і ў прыватнасці т. Жмырко, як старшыня ў святле гэтых дзеянняў паказаў яўную кваздольнасць барацьбы і, замест выкрыцця і барацьбы з фактамі скажэння лініі партыі і сімпатызацый аб іх у ЦККНК РСІ, т. Жмырко і да апошняга часу не ўсвядоміў палітычнай сутнасці гэтых скажэнняў.

Выходзячы з чаго прэзідыум ЦККК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За прытупленне партыйнай пільнасці ў рабоце КК-РСІ і як снем праматаваўшага сябе на гэтай рабоце, т. Жмырко з работы ў ЦККК КП(б)Б знаць і вывесці з членаў парткапегіі ЦККК. Аб гэтым рашэнні інфармаваць чарговы пленум ЦККК.

2. Прыняць да ведама, што тав. Жмырко з работы па чыстцы пельчыцкай парторганізацыі, як старшыня камісіі, вызвален.

Прымаючы пад увагу выяўленыя факты па Рагачоўскаму раёну, — лічыць неабходным азнаёміцца з матэрыяламі правядзення чысткі па Лельчыцкаму раёну і ў залежнасці ад таго, як там была арганізавана работа і вынікі яе — вырашыць пытанне аб патрэбнасці арганізацыі паўторнай чысткі.

3. Прыняць да ведама, што былы сакратар рагачоўскага РК КП(б)Б т. Еўсеенка за дапушчаныя ім грубейшыя палітычныя памылкі на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК выведзен са складу ЦК КП(б)Б, зняты з працы сакратара полацкага РК і РКК абвешчана вымова.

4. Улічваючы памылкі т. Мацко, зробленыя ім у перыяд работы ў Рагачоўскім раёне, лічыць, што ён заслугоўвае выключэння з радоў партыі, але прымаючы пад увагу, што ён у часе чысткі па-партыйнаму прызнаў і асудзіў свае памылкі, даў ім большэвіцкую ацэнку, — абмежавацца папярэджаннем т. Мацко аб тым, што з выгадну паўторэння падобных дзеянняў, т. Мацко паставіць сябе па-за радамі партыі.

Старшыня ЦККК КП(б)Б ЛЬЧЫЦУ.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б САХАРАВА.

РАЗГАРНУЦЬ АГЛЯД СПАБОРНІЦТВА НА ПАСТАНОЎКУ ЎЛІКУ У КАЛГАСАХ

ЦК КП(б)Б вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў, вакол якіх павінна разгортвацца работа ўсіх арганізацый па агляду пастаноўкі ўліку і справаздачнасці ў калгасах.

Наркамзем СССР і рэдакцыйны «Крестьянская газета» пры ўдзеле сельска-гаспадарчага аддзела ЦК ВКП(б), ЦККК ВКП(б) з 20 кастрычніка па 20 студзеня 1934 г. праводзяць усесаюзны агляд-спаборніцтва па лепшую пастаноўку ўліку і справаздачнасці ў калгасах. Асноўная задача агляду заключаецца ў вывучэнні пастаноўкі сістэмы справаздачнасці з мэтай яе спрашчэння, палягчэння і салгата рэзкага скарачэння, а таксама ў паляпшэнні ўліку фінансавай гаспадаркі калгаса, працадзён і ў належнай падрыхтоўцы да своячасовага складання гадавых справаздач за 1933 год.

З часу абвяшчэння агляда прайшло ўжо амаль два месяцы, г. зн. прайшло даволі часу, каб дабіцца ў калгасах практычнага пералому ў бок паляпшэння ўліку і справаздачнасці.

Аднак, матэрыялы з калгасаў сведчаць аб тым, што гэтая работа ў пераважнай частцы раёнаў яшчэ нават не пачыналася. Некаторыя раёны склалі раённы штаб, апублікавалі пастанову ў раённым друку, узялі абавязацельствы па агляду і на гэтым паставілі кропку. Фактычна з 75 раёнаў БССР у конкурс-агляд уключыліся ўсяго толькі 2-3 раёны.

Кіруючыя работнікі раду раёнаў (Любань, Асіпавічы, Старыя Дарогі, Быхаў, Б. Кашалёва, Жлобін) не ўявілі яшчэ ўсёй палітычнай важнасці гэтай работы, лічаць яе другарадным, непатрэбным справай. У некаторых раёнах мы назіраем факты яўна апартуністычных, пагардлівых адносін да справы наладжвання ўліку ў калгасах.

Культпроп Быхаўскага райкома партыі на дамаганні раённага інспектара народна-гаспадарчага ўліку аб уключэнні раёна ў конкурс-агляд запытаў: — Адчапіцеся ад нас, нам няма калі займацца гэтай справай.

У Буда-Кашалёўскім раёне сакратар райкома паспул забыў аб правядзенні гэтага важнейшага задання. На запытанне прадстаўніка кіраўніцтва народна - гаспадарчага ўліка, ці ўключыўся раён у агляд-спаборніцтва, сакратар райкома адказаў: «Не памятаю, здаецца, выносілі пастанову аб гэтым». Аказалася, што два месяцы таму назад такая пастанова была прынята і засталася прыпытай да архіва.

У Слуцкім, Дрысенскім, Церахоўскім раёнах усё яшчэ думаюць нешто зрабіць. Публікуюць умовы агляда, думаюць аб скліканні рахункаводаў, налажванні выездаў і г. д. Аднак, практычнага нічога не робіцца.

У Менску і Гомелі работу яшчэ не пачыналі. У Гомелі нават не складзен яшчэ раённы штаб па спаборніцтву. У Менску, дзе ёсць звыш тысячы чалавек работнікаў уліку нічога канкрэтнага яшчэ не зроблена. Праўда, гарадскі злёт работнікаў уліку ўзяў на сябе рад абавязацельстваў па ўключэнню ў конкурс-агляд. Злёт пастанавіў накіраваць не менш 150 чалавек у калгасы, правесці прымацаванне вучотных калектываў для шэфства над наасобнымі калгасамі, арганізаваць пры Наркамземе пастаянныя кансультацыі па пытаннях калгаснага ўліку. Аднак, усе гэтыя абавязацельствы засталіся на паперы.

Наркамзем, які непасрэдна павінен займацца справай наладжвання ўліку ў калгасах, не палічыў патрэбным уключыцца ў агляд-спаборніцтва. Сектар уліку і справаздачнасці ўзавяжае гэтую справу на арганізацыйны сектар, той у сваю чаргу на сектар уліку, а ў выніку гэтай бюракратычнай спрэчкі Наркамзем стаіць у баку ад справы. А здавалася, хто як не Наркамзем больш за ўсіх зацікаўлен у гэтай справе, які праз месяц павінен атрымаць справаздачы ад 9 тыс. калгасаў.

Узорам большэвіцкага разгортвання гэтай работы з'яўляецца Бабруйскі раён. У Бабруйску арганізаван штаб па правядзенню конкурса, які практычна ўзяўся за гэтую работу. Праведзена парада гарадскіх бухгалтараў, якія ў прамадэсным парадку прымацаваны да калгасаў раёна. Разгорнута індывідуальнае соцспаборніцтва паміж бухгалтарамі на лепшае правядзенне агляда. Некаторыя бухгалтары абавязаліся не пазней 25 студзеня за кончыць складанне баланса калгаса за 1933 год.

Раённая газета «Комуніст» на сваіх старонках сістэматычна асвятляе ход работы па агляду. Пры газеце арганізавана спецыяльная «трыбуна рахункавода», куды рахункаводы з калгасаў дасылаюць матэрыялы аб ходзе спаборніцтва, як гарадскія шэфы канкрэтна дапамагаюць ім у гэтай справе.

Шэфы — работнікі уліку горада, працуючы ў калгасах, таксама шырока выкарыстоўваюць газету для асвятлення метадаў і форм сваёй работы па дапамозе калгасам. Характэрным з'яўляецца выступленне ў «трыбуне рахункавода» работніка Бабруйскай шчацінай фабрыкі тав. Кімермана.

— Шэсць дзён майго прабывання ў пашэфным калгасе «Чырвоны партызан № 1», Бортнікаўскага сельсовета, былі палкам скарыстаны для наладжвання ўліку. Пра верены і вывезены працаднёй кожнага калгасніка да 1-га лістапада, праверана разноска працадзён па асабістых рахунках калгаснікаў.

— Для выяўлення розных непаразуменняў з налічэннем працадзён склікан быў агульны сход калгаса, на якім абгаварвалася пытанні аб правільнасці налічэння працадзён, аб уліку і ахове калгаснай маёмасці, аб рабоце рэвізійнай камісіі.

Тут-жа было разгледжана каля 60 заяў — скарг на няправільны запіс працадзён, з якіх 42 задаволены. Калгаснікі ўзялі шмат рацыяналізатарскіх прапаноў па паляпшэнню ўліку.

6 калгасаў раёна пераведзены ўжо на двайную сістэму бухгалтэрыі, намечана перавесці яшчэ тры калгасы.

Даклад Эрыо аб СССР

ПАРЫЖ, 14 снежня (БЕЛТА).

У парламенцкай камісіі па замежных справах ЭРЫО зрабіў даклад аб СССР. Ён пачаў з заявы, што намеран абараняць свае погляды па СССР, не зважаючы на зневажанні і нават пагрозы, якім ён падпадаў з боку беларвардзейцаў (апладысменты).

Затым Эрыо адзначыў аграмадны рост міжнароднага ўплыву СССР (устанаўленне нармальных дыпламатычных адносін з ПАЗША, заключэнне пакцтаючых канвенцый аб азначэнні агрэсара) і падкрэсліў, што ў цяперашняй багатай небяспекай абстаноўцы СССР цвёрда абараняе справу міра.

Эрыо даў кароткую характарыстыку совецкай канстытуцыі, адзначыўшы, што совецкі ўрад праводзіць палітыку самаазначэння нацыянальных меншасцяй і садзейнічае развіццю нацыянальнай культуры. Пры гэтым ён расказаў аб сваіх уражаннях ад наведання Украіны, адзначыў буйны рост украінскай культуры, павялічэнне тыража украінскага друку і г. д.

Пераходзячы да эканомікі Совецкага Саюза, Эрыо, спасылаўшыся на сведчанне былога французскага міністра земляробства Борэ, заявіў, што адсталая тэхніка сельскай гаспадаркі ў старой Расіі не давала магчымасці пракарміць насельніцтва. Вось чаму пераход да калектывізацыі, булаўніцтва соўгасаў і механізацыя сельскай гаспадаркі былі неабходны.

Параўноўваючы свае цяперашнія ўражанні аб СССР з успамінамі аб наведанні СССР у 1932 годзе, Эрыо канстатаваў аграмадны прагрэс сельскай гаспадаркі і рост дабрабыту на сельніцтва.

Прыводзячы дакументальныя сведчанні чужаземцаў, наведаўшых СССР, і спасылаючыся на свае назіранні, Эрыо абвяргаў паклёпніцкія выдумкі ворагаў СССР аб «голадзе і дэградацыі сельскай гаспадаркі».

— У асаблівасці, — заявіў Эрыо, — яго здзівілі развіццё навуковых і навукова-даследчых сельска-гаспадарчых устаноў, развіццё механізацыі сельскай гаспадаркі, рост колькасці трактараў і камбайнаў на сяле, а таксама прыстасаванне авіяцыі ў сельскай гаспадарцы.

Разам з тым Эрыо агаласіў пастанову ўрада СССР аб вольным гандлі хлебам у абласцях, выканаўшых свае абавязацельствы перад дзяржавай і закончыўшых засыпку насенных фондаў.

Затым Эрыо падрабязна спыніўся на сваіх уражаннях ад наведання Харкава і Кіева.

«Як чалавек, які 20 год знаходзіцца на пасту мэра горада Ліона, — сказаў Эрыо, — я магу засведчыць што камунальная добраўпарадкаванасць гэтых гарадоў пастаўлена высока.

— Яшчэ больш дзіўна, — заявіў Эрыо, — праходзіць працэс індустрыялізацыі ў СССР. Краіна ахоплена вытворчай ліхаманкай».

Вялізарнае ўражанне зрабіла на аўдыторыю паведамленне Эрыо аб ударніцтве, аб планавым характары совецкай гаспадаркі, аб барацьбе з бюракратызмам.

Даклад яго ў гэтых мясцах не раз перапыняўся апладысментамі. Эрыо прыйшоў таксама лічбы аб росце здабычы вугалю, нафты, аб выпуску аўтамабіляў, трактараў, электрычнай энергіі, працытаваў 6 умоў т. Сталіна і паведаміў, што ДнепраДЭС зрабіў на яго вялікае ўражанне.

Расказаўшы аб будаўніцтве Магнітагорскага завода, Кузнецкага завода, Беламорска-Балтыцкага канала, Эрыо адзначыў «энтузіязм рабочых СССР, для якіх праца стала справай гонару».

«Нельга не захапляцца гэтай мужнасцю»,—заявіў ён.

Затым Эрыо падрабязна спыніўся на арганізацыі працы на прадпрыемствах, у прыватнасці на барацьбе з урачыстлаўкай, асвятляў становішча спецыялістаў. Пры гэтым ён ахарактарызаваў прамысловае развіццё Совецкага Саюза «як гіганцкае і цудоўнае».

У заключэнне, закранаючы Чырвоную армію, Эрыо адзначыў яе высокую баяздольнасць і асабліва падрабязна спыніўся на яе тэхнічнай узброенасці і матарызацыі.

«Совецкая авіяцыя, — сказаў ён, — гэта вялізарная сіла».

Пры гэтым ён спаслаўся на сведчанне міністра авіяцыі П'ера Кот. «Совецкі Саюз,—сказаў Эрыо,—горача прывязан да сваёй арміі. Чырвоная армія акружана пашанай і любоўю».

Падагульваючы прамову, Эрыо заявіў, што незалежна ад рознасці палітычнага ладу Францыі і СССР нельга ігнараваць вялізарную краіну, ахопленую магутным царывам, воляй к дзеянню і рэвалюцыйным дынамізмам, краіну, якая імкнецца наперад. Рэспубліка, заснаваная на працы, на пашане да працы, можа смела глядзець у будучае. Совецкі Саюз хоча міра і з выдатнай настойлівасцю не паддаецца правакацыі. Грамадская думка Францыі, — закончыў Эрыо, — павінна добра абдумаць усё і зразумець неабходнасць збліжэння з Совецкім Саюзам у інтарэсах міра і Францыі.

КАТОК

Пасля дзеняці, калі пад катком разгараюцца чырвоныя транспаранты, мільгаюць гірлянды электрламп і трымціць бадзёрым маршам аркестр — на вялікім ільдзяным полі пачынаюць непадзельна панаваць смех, бадзёрасць, маладосць, радасць. Каток расцілаецца шкляной роўніцай, надзейна заліты, старанна дагледжаны. І лавіць срэбных пырскі з-пад ног нязлічоных канькабежцаў.

На лёд ідуць як на лепшы адпачынак і зарадку пасля ўдарнай працы тарбары і абутнікі, металісты і хімікі, друкары і дрэваапрацоўшчыкі, ідуць студэнты, вайскоўцы, настаўнікі.

Каток у садзе «Профінтэрн» сёлета сваячасова распачаў гэты нязвычайны, вясёлы сезон. 6-е снежня было першым урачыстым днём менскіх канькабежцаў: каток адкрыўся! Летась каток пачаў працаваць толькі 11 студзеня.

Параўнальна з мінулым каток «Профінтэрна» сёлета значна лепш падрыхтаваўся да фізкультурнай зімы. Абсталявана раздзявалка з вешалкай на 2.000 нумароў, ёсць 100 пар пракатных канькоў, буфет. Спецыяльны інструктар-масавік праводзіць работу сярод канькабежцаў, бадзёра, жыццярадасна завяваюцца на ільду калектыўныя гульні — і лёд весела іскрыцца пад электрычнымі праменнямі, пад неўгамонныя «хакейкамі», пад маладым і дружным топатам.

У студзені на палным катку, на яго бегавой дарожцы (400 × 8 метраў — нармальны міжнародны размер!), оструенуцца выдатнейшыя канькабежцы Саюза. Апроч розыгрыша першынства па бегу адбудзецца спаборніцтва па фігурнаму катанню, па хаккею. У плане работы катка—шматлікія сустрэчы менскіх фізкультурнікаў з лепшымі камандамі Гомеля, Віцебска, Бабруйска.

Кожную пасяднеўку каток арганізуе ў сябе так званы дзень выходнка, калі рабочыя менскіх прадпрыемстваў задоўга да вечара запаўняюць шкляную пляцоўку ў садзе «Профінтэрн», калі на ільду праводзіцца культывылазка.

... Дзе ні дзе, на ўскраіне блакітнай пляцоўкі, раптам спыхвае песня, раздзяваюцца мяхі гармоніка, звіняць балалаечная струна, рады ўслонаў і крэслаў раптам вырастаюць на катку, рэжуць свежае, здаровае паветра галасы прамоўцаў,—культывылазка завяваючай праходзіць на дзіва дружна і ўдыхмна!

Але мае рацыю загадчык катка тав. Баршчоў, скардзячыся на яшчэ невыстарчальную ўвагу да гэтай справы з боку фізкультурных і прафсаюзных арганізацый.

Каток — у веданні гарпрафсавета. Але ці знімае гэта адказнасць за пастаноўку работы на ім з гарсовета фізкультуры, з ВСФК?

Між тым, пакуль што яўна не хапае пракатных канькоў, не задавальняюць памяшканні раздзявалкі, буфета. Вельмі цяжка прыходзіцца 6-ці тэхнічным работнікам, што абслугоўваюць каток; пры яго штодзённай звышнапруэцы, патрэбна значна павялічыць штат.

18-га ў гэтым-жа садзе, на веладроме, адкрываецца спецыяльны дзіцячы каток. Неўзабаве будзе гатоў каток стадыёна «Дынамо». Але фізкультурны Менск патрабуе большага! І варта падумаць пра арганізацыю яшчэ двух-трох пляцовак, або хоць бегавых дарожак — на Ўсебеларускім стадыёне, у чыгуначнікаў і інш.

... Вечарамі над катком чырванеюць паляшнікі з лозунгамі, грымяць трубы аркестра, серабрыцца лёгкі туман, — на лёд радасна рушыць моладзь «Комунара», «Большэвіка», «Варашылаўца».

ЮР. ЛЯВОННЫ.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

★ СНК БССР дазволіў НК камунальнай гаспадаркі склікаць на 24 снежня ЎСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД ПА ЖАРНЫХ РАБОТНІКАЎ. З'езд падагуліць вынікі работы за 1933 год і вызначыць шляхі паляпшэння пажарнай аховы ў рэспубліцы.

★ Пасёлак Любаш, Магілеўскага раёна, вызначан СНК месцам пабудовы першага ў БССР КАЛГАСНАГА САНАТОРЫЯ.

★ Замест бібліятэк пасобных народных камісарыятаў пры Доме ўрада арганізуецца спецыяльнае АДДЗЯЛЕННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ БІБЛІЯТЭКІ і бібліяграфічнага інстытута імя Леніна. СНК прапанаваў дзяржаўнай бібліятэцы разгарнуць работу па камцэнтрацыі і апрацоўцы кніжнага фонда аддзялення з тым, каб адкрыць яго 1 студзеня 1934 г.

ЗАМЫСЛЫ ГЕРМАНСКАГА ФАШЫЗМА

ПРАЕКТ „СЯРЭДНЯЯ ЎРОПЫ"

ВАРШАВА, 14 снежня. (БЕЛТА)

Берлінскі карэспандэнт «Газеты варшавскай» лічыць, што вельмі характэрнае святло на ўсходнія канцэпцыі нацыянал-соцыялістаў кідае заява Розенберга, зробленая ім пры адкрыцці выстаўкі «Германскі Ўсход», а таксама артыкул Коха ў «Фелькішэр бобахтэр».

«У гэтых выступленнях, — піша карэспандэнт, — можна знайсці растлумачэнне новай мірнай палітыкі Германіі ў адносінах Польшчы. Кіруючая ідэя гэтай палітыкі — федэратыўная пабудова Ўсхода. Мы не даем, што гэта азначае імкненне аўладаць Усходам, г. зн. Польшчай, Украінай, нават СССР, і падпачаліць Усходнюю Эўропу кантролю і ўплыву Германіі. Аб гэтым сведчыць выстаўка «Германскі Ўсход».

„ПОЛЬШЧА ПАВІННА ВЫСТУПІЦЬ СУПРОЦЬ ГЕРМАНСКІХ ПЛАНАЎ"

ПАТРАБАВАННЕ „ГАЗЕТЫ ВАРШАЎСКАЙ"

ВАРШАВА, 14 снежня. (БЕЛТА).

Як паведамляюць у парламенцкіх колах, апазіцыя выступіла з патрабаваннем датэрміновага склікання замежнай камісіі сойма, бо хоча даць адпор тым настроям, якія, на яе думку, стварацца германскай стараной.

Вельмі характэрна ў гэтых адносінах перадавая «Газеты варшавскай». Вызначаючы палітычную лінію германскага ўрада, «Газета варшавска» прыходзіць да наступнага вывада.

«Гітлер астаўся верным сваім прынцыповым установкам і бачыць будучае Германіі толькі ў экспансіі на Ўсход; ён ведае, аднак, што заваяваць Усход ён сёння не можа ўзброенай сілай, і таму старацца дабіцца сваей мэты мірнымі шляхамі. Кіруючай для яго з'яўляецца наступная ідэя: накіраваць палітычную экспансію Польшчы на Паўднёвы Ўсход і аб'яднаць Сярэдня-Ўсходнюю Эўропу для барацьбы супроць СССР пад кіраўніцтвам Германіі. Такім чынам, адпадаецца старая ідэя «Міттэль-Эўропа» («Сярэдняя Эўропы»).

На гэтай аснове сапраўды была-б магчыма трывалая і далёка ідучая польска-германская згода. Але за такую згоду Польшча павінна была-б, зусім натуральна, заплаціць Германіі сваімі заходнімі землямі і ўходам з морскага ўзбярэжжа».

Далей «Газета варшавска» заяўляе:

«Умовай для заняцця Польшчай пазіцыі вялікай дзяржавы і незалежнай дзяржавы з'яўляецца захаванне морскага ўзбярэжжа і вусця Віслы. Гэта перашкаджае ажыццяўленню моцнай і глыбокай польска-германскай згоды.

Калі Польшча не хоча адмовіцца ад сваіх заходніх зямель, калі хоча быць самастойнай, калі хоча захаваць сваю дзяржаўнасць, яна павінна выступіць супроць германскіх планаў «Міттэль Эўропе» (Сярэдняй Эўропы), павінна дабіцца ўрэгулявання сваіх адносін з СССР, павінна адмовіцца ад федэралістычных планаў і быць гатовай процідастаяць уласным сілы германскім сілам, адным словам, павінна павярнуць свой абарончы фронт супроць Германіі. Толькі такая палітыка можа быць названа польскай палітыкай. Гэта не выключае, вядома, ні імкнення рэгуляваць бягучыя адносіны з заходнімі суседзямі, ні раўнаў з імі адносна адхілення канфліктаў другараднага характару».

Паведамленне ЦК ЛКСМБ

ЦК ЛКСМБ ЗАПРАШАЕ ДЛЯ ЎДЗЕЛА Ў ЮБІЛЕЙНЫМ ПЛЕНУМЕ ЦК ЛКСМБ 18 СНЕЖНЯ, ПРЫСВЕЧАНЫМ ПЯТНАЦЦАЦІГОДДЗЮ КОМСОМОЛА БЕЛАРУСІ НАСТУПНЫХ СТАРЫХ КОМСОМОЛЬЦАЎ:

І. РАТНЕР (політэхнічны інстытут, Менск); ВАРОНЧАНКА (агітмас менскага ГК КП(б)Б); МІРЫНГОФ (ЦК КП(б)Б); ДЗЕНІСКЕВІЧ (ЦК КП(б)Б); ДАВІДОВІЧ (Нарнамасветы); КУРЦІК (рэдактар газеты «Віцебскі пролетарый»); ФРЫДЛЯНД (ЦК КП(б)Б); ДЖЭЛЮК (рэдакцыя газеты «Звязда»); РОХКІН (фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі»); ОЛІКЕР (нарком аховы здароўя); КРАВЕЦ (вучэбны камбінат); ЛАБАДАЕЎ, ТАМАРКІН (ЦК КП(б)Б); КРОЛЬ (УНР); МІЛЯЎСКІ (АДПУ); ГЕРШОН (ГК КП(б)Б); БАГДАНАЎ (магілеўскі РК КП(б)Б); ВІННІКАЎ (цэнтр. Дом тэхнікі); РАСТОЎСКАЯ (Смалявіцкая МТС); СОСІНАЎ (Менская МТС); ОКУР (ВКСГШБ), ПАЛЕЕС (Орша); СІМУНІН (Віцебск); ВАКСМАН (Менск); АЦАРОВІЧ (Менск); РОЗЭНБЛЮМ (Крычаў).

КОМСОМОЛЬЦЫ ЎЗНАГАРОДЖАНЫЯ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА ДОСІН (Менск); ОСТАШКО (Віцебск).

ЦК ЛКСМБ.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Згодна пастановы бюро ГК КП(б)Б па гор. Менску 20 снежня г.г. вызначан

АДЗІНЫ СОВЕЦКІ ДЗЕНЬ

Ва ўсіх прадпрыемствах і установах праводзяцца ў гэты дзень масавыя сходы рабочых з парадкам дня:

1. Рашэнне прэзідыума ЦВК СССР па дакладу Менскага гарсовета.
2. Даклад дэпутацкай групы аб сваёй рабоце.
3. Справаздача членаў гарсовета.
4. Давыбары новых членаў гарсовета замест выбыўшых.

Сакратарам партканцэлярыяў і ячэек правесці падрыхтоўчую работу і забяспечыць актыўны ўдзел рабочых і працоўных на сходах.

За сакратара гаркома КП(б)Б ГЕРШОН.

***

— Да вялікага прапагандыстаў партсекці г. Менска.

Культпроп Менгаркома прапануе чарговыя заняткі па партвучобе 16 снежня прысвяціць прапрацоўцы даклада тав. Косіора і выступленне тав. Постышава на лістападаўскім пленуме ЦК КП(б)Б.

Культпроп ГК.

— 17 снежня ў 6 гадзін вечара ў 12 пакоі гаркома комсомола абудзецца пашыраная нарада культпропаў комсомольскіх ячэек і калектываў, прапагандыстаў і старост комсомольскіх палітшкол і гурткоў.

Яўка абавязкова.

— Культпроп ЦК КП(б)Б і культмасавы аддзел ЦСПСБ паведамляюць, што прызначаная на 15-га снежня г.г. а 6 гадзіне ўвечары нарада па пытанню становішча прафпалітнавучання на прадпрыемствах перанесена на 18 снежня г.г. а 6-й гадзіне вечара ў ЦК КП(б)Б.

Культпроп ЦК КП(б)Б. Культмасавы аддзел ЦСПСБ.

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 17 і 18 снежня г.г. будзе працаваць рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый па гастановы жлобінскай і будакапалеўскай райкамісій, наступных т.т.

17 СНЕЖНЯ Ў г. ЖЛОБІНЕ:

Круцікаў П. С., Вараб'ёў А. І., Бабкоў Н. Ф., Кавалёў К. А., Сідорка Л. С., Чэрнякоў П. В., Спірыдонаў А. М., Лісойчыкаў Т. Г., Навакоўскі Е. Я., Турлай О. Ф., Пагфёнка К. Ф., Непачаты С. А., Юніга А. І., Пракофенка К. І. (Буда-Кашалёўскі раён);

Янушка І. І., Еўсееў Ф. А., Паўловіч І. М., Карупчык А. І., Гурэвіч М. Л., Грышкоў Н. Г., Равякоў Г. К., Гаравой Н. Г., Сосна Н. І., Барсукоў І. П. (Жлобінскі раён).

18 СНЕЖНЯ Ў г. ЖЛОБІНЕ:

Казлоў П. Э., Непакойчыцкі А. А., Васараўдзіо І. С., Старасотнікаў В. К., Чыкілёў І. Д., Медведзеў П. К., Касцешка І. У., Купрыленка І. Г., Лукін І. Г., Равякоў Е. І., Селіцкі І. Е., Чэрнякоў Ф. Д., Марозаў І. В., Зенчук Н. М., Тупнік І. Н., Каралёў І. С., Наяшонак А. Е., Курскі І. С., Еўдаразеў А. Е., Сапчук А. І., Боброк С. К., Гранкоў М. В., Жабко А. В. (Жлобінскі раён).

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б паведамляе, што з 17-XII-33 г. у г. Менску будзе працаваць выязная тройка Цэнтральнай камісіі ВКП(б) па чыстцы па разгляду апеляцый на пастановы рэспубліканскай камісіі наст. тт.:

17-XII-33 г., у 12 г. ДНЯ, У Г. МЕНСКУ:

Юокумовіч З. М., Столін Б. А., Шарынц Н. Я., Берлін І. Ф., Вашкевіч П. С., Дуброўскі В. Ф., Дамброўскі А. Г., Кляцнельсон Г. Я., Лазакевіч Н. Е., Патапоўч А. К., Раманоўскі К. П., Шульц Н. Р., Пікулік І. А., (Бабруйскі р-н).

Дакук В. Н., Курманаў М. Ф., Медзельян А. П., Русецкі В. В (Барысаў). Медзведзеў І. Е., Галоўчін І. І., Касцяровіч А. Л. (Дзяржынск); Лонь Ф. Н. (Заслаўе); Паваротны Д. С., Мрочак А. І., Басок В. Г. (Пухавічы); Арцішэўскі К. Ф., Бойкопчук К. В, Грынберг Л. Б., Мышкоўскі С. З., Мінькова С. З., Мірос М. Я., Саўко І. М., Фрыдлянд Е. Т. (Менскі раён); Грышкевіч К. М., Заполь М. Р., Кострыцкі М. Р. (Узда); Белашоўскі В. А. (Лагойск).

18-XII, У 10 Г. РАН., У Г. МЕНСКУ:

Гольдзін А. І., Вігнін І. Е., Самсоненка В. П., Мошэль З. П., Шліомовіч Х. М. (Віцебскі р-н); Варонцоў І. М., Воранаў А. Е. (Горацкі р-н); Смоліч В. А. (Гарадоцкі), Сапожнікаў Г. С., Смерковіч І. Я., Ганцман Ц. І., Калан Э. Б., Леопькоў Т. В., Рыкоў Г. І., Саракалетаў А. А. (Гомельскі р-н); Комлач А. А., Янкоўскі П. Ф., Кудрацкі П. І., Корецкі А. С., Меламед О. Л. (Оршанскі раён); Гуніч Т. М. (Плешчаніцкі р-н); Абрутін А. А., Дзегцярэў К. А., Бяхтіноў Я. С. (Рэчыцкі р-н); Борода М. М. (Талачынскі р-н); Іваноўч М. П., Каждан С. А. Антосюк В. Т., Майсееў В. А., Сушкевіч А. А., Гурыноў К. С., Гольдзін В. В. (Чэрвеньскі р-н).

19-XII, У 10 Г. РАН., У Г. МЕНСКУ.

Калічонак А. А. (Бятомльскі р-н); Дзеранко П. І., Герасімаў М. М., Талмашоў В. М., Зверкынскі А. І., Аронаа С. Г., Дзергач З. Е. (Веткаўскі р-н); Слуцкі І. А. (ДПУ); Куклін П. М. (Ветка); Карпаухаў М. М., Гудынаў В. П., Урбан В. В., Дзефаў Ф. М. (Дрысенскі р-н); Арцішэўскі М. І., Берковіч П. І., Канцілоўіч Ф. Н., Самоцюк С. Д., Радкевіч С. А. (Капыльскі р-н); Дзеч'ячэнка Я. В. (Крычаўскі р-н); Кізнін І. П. (Лёзненскі р-н); Земцаў І. Я., Лазараў Л. А., Пальчык З. І., Комельянскі Я. Л., Фралкін І. Р., Эпштэйн Г. Ш., Ванілер Н. Г., Заранкін Н. Я. Кацкін Я. Ш., Кац С. Г., Раскіна Г. В., Хрыстоніч Н. А., Штэйнберг О. Ф., Якутовіч Г. І., Суренскі П. Л. (Магілеў); Варысенка Ф. М., Булаўко П. І., Гормаш Л. П., Дуброў П. С., Касцюкоў К. І., Овідзюўскі В. П. (Мазырскі р-н); Балай М. Р., Зіньковіч А. С. (Тураўскі р-н); Неволін Н. Ф., Мітлін М. З., Сарскін К. І., Іваноў І. М., Фельдман М. І., Пятроў М. М., Пшытыць Е. Г., Лабанок П. Ф., Фралоў Т. Ф., Семілецкіна Г. І., Сотнікоў І. Г., Школьнік С. І., Чалей А. І., Сухоў А. Н., Віцеркоў П. В., Глозеў І. Д., Васін А. А. (ваеннае); Бабруйскі А. В., Федоненка Я. П., Альтшулер І. М., Шэйман В. С. (Полацкі р-н), Косцко Б. Ф. (Асвейскі) Тарыкоў А. В. (Расоны); Петрышч С. П. (Ушацкі р-н).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Па БССР

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

У СТУДЗЕНІ Ў МЕНСКУ АРГАНІЗУЕЦЦА БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ З СІМФАНІЧНЫМ АРКЕСТРАМ У 65 ЧАЛАВЕК. ФІЛАРМОНІЯ БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ У БУДЫНКУ КЛУБА ІМЯ ЛЕНІНА НА РАГУ ВУЛІЦ ІМЯ К. МАРКСА І УРЫЦКАГА.

ДЛЯ РАБОТЫ Ў ФІЛАРМОНІІ І КАНЦЭРТНЫХ ВЫСТУПЛЕНЯЎ БУДУЦЬ ЗАПРОШАНЫ ТАКСАМА МУЗЫКАЛЬНЫЯ РАБОТНІКІ І АНСАМБЛІ З ІНШЫХ РЭСПУБЛІК САЮЗА.

МАСТАКІ БССР—З'ЕЗДУ ПАРТЫІ

Мастакі БССР рыхтуюць да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б) УСЕБЕЛАРУСКУЮ ВЫСТАЎКУ ЖЫВАПІСІ, СКУЛЬПТУРЫ І ГРАФІКІ, якая адаб'е поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў Совецкай Беларусі.

На выстаўцы будуць прадстаўлены работы мастакоў Волкава, Пашкевіча, Ахрэмчыка, Кастылянскага і інш.; па скульптуры Грубе, Бразера, Керзена, Азгура; па графіцы—Гусева, Жытніцкага і інш. Спецыяльная дэлегацыя саюза совецкіх мастакоў выехала ў Маскву для збірання работ пражываючых там беларускіх мастакоў.

З Гомеля ўжо атрыманы работы мастака Шэўчэнко. Работа вядзецца ў Віцебску.

На выстаўцы арганізуецца аддзел праектаў афармлення гарадоў БССР да пролетарскіх свят.

ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ ГАРАДОЎ БССР

Адпушчаны 3.500 тыс. руб. на далейшыя работы па электрыфікацыі гарадоў Совецкай Беларусі на 1934 год. У план уключана пабудова НОВЫХ гарадскіх электрастанцый у СЛУЦКУ і МАЗЫРЫ. Будзе закончана пашырэнне Гомельскай электрастанцыі. Дасабсталёўваюцца полацкая і бабруйская электрастанцыі.

Рэдакцыя газеты „ЗВЯЗДА" склікае на 17 снежня, у 7 г. веч. нараду па пытанню

АБ РЭАЛІЗАЦЫІ СОЦДАГАВОРА

па дарбудаўніцтву з Чувашскай АССР.

НА НАРАДУ ВЫКЛІКАЮЦЦА:

Леўкоў (ЦВК); Іваноў, Гольдштэйн, Грозная, Ліўшыц, Гохфельд, Гаруновіч, Хайкін, Гордзін, Ражаноўскі, Тарасевіч, Фаловіч і Туркевіч (Газоўтартрэст), Скарабагацька (ЦК КП(б)Б) Біге і Іваноў (ЦКК КП(б)Б); Гольдзін (ЦП дарожнікаў); Корф (ЦС Аўтадора), адказныя прадстаўнікі Наркамзема БССР, палітсектара НКЗБ, НК соўгасаў, трактарацэнтраў, ЦК ЛКСМБ, гарсовета Аўтадора, Наркамснаба, ЦП працасветы і прадстаўнікі цэнтральных газет.

Нарада адбудзецца ў памяшканні «З в я з д ы» (3-ці паверх, пакой № 5).

Рэдакцыя „Звязды".

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Увага прафарганізацый.

ПАПЯРЭДНІ ПРОДАЖ білетаў на першыя два дні (19 і 20 снежня)

пастаноўкі ГУКАВОГА мастацкага фільма

КАНВЕЕР СМЕРЦІ

ПРАВОДЗІЦЦА штодзённа з 16 снежня ад 1 да 4 гадз. дня.

Білеты прадаюцца толькі арганізацыям па калектыўных заяўках.

Званіце па тэлеф. № 21-146 ад 1 г. да 3 г. дня і вам на прадпрыемства даставяць патрэбную колькасць білетаў для калектыўнага культпаходу.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА.

16 і 17 снежня Опера

Мастацкі кіраўнік, галоўны дырыжор заслужаны артыст рэспублікі тав. ГІТГАРЦ І. А.

КАРМЕН

муз. Бізэ.

Пачатак роўна у 8 гадз. вечара

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

вул. Валадарскага, 7, тэл. № 21-813)

Сёння, 16 снежня

РЭКРУТ

Пастаноўка заслужанага артыста рэспублікі М. Ф. РАФАЛЬСКАГА.

Пачатак у 8 гадз. вечара

Кіно-тэатр ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Замежны мастацкі фільм ЖАНЧЫНА У АГНІ

Кіно ПРОЛЕТАРЫЙ — МЕРЫ ПКФО РД у барацьбе МЫЛЬНАЯ ПЕНА

Кіно Інтэрнацыянал — Мастацкі замежны фільм СЯБРОЎКА МАРАКА (Каханне і абавязак)

Кіно СПАРТАК — Замежны фільм ЗЯЛЁНЫ ЗАВУЛАК дрэма ў 6 частках.

ПРАДАЮЦЦА жылыя і халодныя будынкі

Давядацца ст. Калодзішчы, БССР, Калодзішчанскі сельсавет, Менск, раёна.

Навучальны камбінат Беларускай канторы „Союзоргучет"

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР на пяцімесячныя КУРСАНТАЎ КУРСЫ

па падрыхтоўцы бухгалтараў для работы на ільназаводах у сістэме Белільнатрактарацэнтра.

На курсы прымаюцца асобы са стажам работы па рахункаводству не менш двух год і асвятай не ніжэй сямігодкі. Стыпендыя ад 110 да 140 р. і кватэрных 25 руб. у месяц. Заявы з дакументамі—1) аб соцпаходжанні, 2) аб адукацыі, 3) аб узросце, 4) аб працоўным стажы, 5) даведка аб аслабленні з апошняга месца работы—накіроўваць па адрасу: Менск, Міхайлаўская 1-4, навучальнаму камбінату „Союзоргучет".

Тэрмін падачы заяў— 18 снежня г. г.

Заявы без дакументаў разглядацца не будуць. Аб залічэнні і пачатку заняткаў будзе паведамлена на пошце.

Навучальны Камбінат „Союзоргучета"

Наркамзем БССР запрашае для работы ВЫКЛАДЧЫКАМІ ў трактарныя школы (Сянно, Гарадок, Слуцак, Рагачоў)

1) Спецыялістаў па с.-г. машынам
2) Спецыялістаў па трактарнай справе.

За ўсімі даведкамі звярнуцца ў Наркамзем БССР, сектар кадраў.

Да 17-га з'езда ВКП(б) і 15-га з'езда КП(б)Б

Ці забяспечылі Вы сябе падпіскай на газеты і журналы?

ПРАДПРЫЕМСТВЫ, УСТАНОВЫ, ВАЙСКОВЫЯ ЧАСЦІ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫЯ САЮЗЫ, КЛУБЫ І ЧЫТАЛЬНІ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПАДПІСЧЫКІ.

У гэтым месяцы канчаецца тэрмін Вашай падпіскі.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1934 год на ўсе ГАЗЕТЫ і ЖУРНАЛЫ.

ПАМЯТАЙЦЕ: сваячасова зданая падпіска і на больш доўгія тэрміны забяспечвае акуратную дастаўку друку.

ПАДПІСКУ ЗДАВАЙЦЕ: у гарбюро „Саюздрук" (буд. пошты, 2 паверх), штатным работнікам „Саюздрук", маючым адпаведныя пасведчанні, лістаносцам і газетным кіёскам, з дастаўкай на дом і праз кіёскі.

Па тэлефону № 23—652 выклікайце работніка „Саюздрука" для прыёма падпіскі.

Апошнія тэрміны прыёма падпіскі:

На МАСКОЎСКІЯ выданні 24 СНЕЖНЯ. | На МЕНСКІЯ выданні 26 СНЕЖНЯ.

Не адкладвайце здачы падпіскі на апошнія дні.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР

Сёння і штодзённа — мастацкі гукавы фільм

БЛАКІТНЫ ЭКСПРЭС

У праграме гукавая хроніка СЮЗКІНО.

Пачатак сеансаў 3, 5, 7, 8-30 Каса адкрыта з 2 гадз. дня.

ТРЭСТУ БЕЛДЗЯРЖКІНО ПАТРЭБНЫ на сталую працу:

Эканаміст-планавік
Эканаміст-фінансіст
Эканаміст-статыстык
Старшы бухгалтар
Машыністка.

Звяртацца: Менск, Совецкая 90, 2 паверх. (Будынак кіно „Чырв. зорка").

Тэлефон сектара абвестак № 21-350

Менскі Яўрэйскі сельска-гаспадарчы тэхнікум у Курасоўшчыне правядзіць СТУДЗЕНЬСКІ НАБОР на 1 курс малочна-зоатэхнічнага аддзялення

Заявы з адпаведнымі дакументамі прымаюцца да 25-XII на адрасу: Менск, Курасоўшчына, яўрэйскі сельска-гаспадарчы тэхнікум.

Правядзе прыёма згодна даведніка Наркамасветы.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам і сталоўкай.

Дырэктар.

Менск, друкарня «Звязды» Галоўлітбал № 337.